Модная калекцыя з нацыянальным каларытам

СТАР. 3

Як сачыць за псіхічным здароўем

СТАР. 4

Кармэн па імені Ларыса

СТАР. 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СЕРАДА № 202 (28312)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВАЖНЫ НАПРАМАК

Беларусь і Татарстан пашыраць супрацоўніцтва ў нафтагазавай сферы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Прэзідэнтам Татарстана Рустамам Мініханавым прапанаваў прыцягнуць «Беларуснафту» для работы ў нафтавай галіне Татарстана, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў беларускага лідара, супрацоўніцтва Беларусі і Татарстана ў нафтагазавай сферы з'яўляецца важным напрамкам. «Я вельмі прасіў бы вас — у нас ёсць добрая кампанія «Беларуснафта», але аб'ёмы здабычы ў нас падаючыя. У свой час нафту выпампавалі і вывезлі з Беларусі. Таму мы хацелі б, каб наша кампанія знайшла ў вас аб'ём работ. Паверце, гэта будзе значна танней за любыя кампаніі. Каб на субпадрадах або яшчэ неяк «Беларуснафта» працавала з вамі. Думаю, улічваючы нашы вельмі добрыя адносіны, вы знойдзеце выгадны кавалак работы для гэтай кампаніі і абавязкова з выгадай для сябе», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «Беларуснафта» мае добры вопыт работы ў іншых краінах свету.

Кіраўнік дзяржавы ўзгадаў аб супрацоўніцтве з кампаніяй «Татнафта», якая адкрыла ў Беларусі сетку запраўчных станцый. «Патэнцыял у нас значна большы. Мы можам дамовіцца аб больш шырокім уключэнні вашай кампаніі ў супрацоўніцтва і рэалізацыю вашых праектаў тут, у Беларусі. Гэта датычыцца і перапрацоўкі нафты, і продажу нафтапрадуктаў, і работы за межамі Беларусі, — заявіў Прэзідэнт. — Хацелася б, каб вы непасрэдна мне акрэслілі інтарэс вашай кампаніі. Канкурэнцыя цяпер вельмі высокая. І я баюся, што тут могуць быць нейкія непаразуменні. І не дай бог яшчэ нехта кагосьці лабіруе на шкоду разважлівасці і справядлівасці».

«У нас два нафтаперапрацоўчыя заводы. Калі ў вас ёсць інтарэс да работы з гэтымі прадпрыемствамі і пастаўкі нафтапрадуктаў на знешнія рынкі, мы можам дамовіцца на прымальных умовах», — дадаў беларускі лідар.

У сваю чаргу Рустам Мініханаў падзякаваў за падтрымку ў рэалізацыі праектаў «Татнафты» ў Беларусі. «Мы гатовы яшчэ пабудаваць чатыры сучасныя станцыі, — сказаў ён. — «Татнафта» працуе, пастаўляе нафту. Але сёння мы павінны ўжо глядзець у бок больш глыбокай інтэграцыі. Магчыма, нейкія нафтахімічныя праекты».

«Нам цікава развіццё нафтахімічнага блока. Тым больш, у «Татнафты» ёсць шынная вытворчасць. Мы атрымліваем кампаненты для шын з Беларусі. Тут нам патрэбна больш глыбокая ўзаемавыгадная інтэграцыя. Мы шмат чулі, што вашы нафтавікі — прафесіяналы і маюць канкурэнтную цану па аказанні сэрвісаў. Такое даручэнне мы дадзім і будзем прыцягваць беларускіх калег на сэрвісныя працэдуры», — заявіў Прэзідэнт Татарстана.

НА ПРАГУЛКУ — У ПАЛАЦ РАДЗІВІЛАЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маладыя матулі з Нясвіжа Юлія ГУБЧЫК, Яўгенія ВАСЕНЬКОВІС і Наталля ГУБЧЫК (на здымку) у прыгожыя дні кастрычніка гуляюць са сваімі немаўлятамі па алеях палацавага комплексу Радзівілаў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:

«На аздараўленне школьнікаў у перыяд асенніх канікул выдзелена 1,34 млн рублёў са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Магчымасць адпачыць і ўмацаваць здароўе на працягу шасці дзён асенніх канікул у лагерах з дзённым знаходжаннем атрымаюць больш за 62 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак. Фінансаванне на гэтыя мэты выдзелена з разліку Br3,58 на адзін ложка-дзень, або Br21,48 на пуцёўку. У лагерах для дзяцей традыцыйна арганізуюцца і аздараўленчыя, культурныя, спартыўныя мерапрыемствы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2016 г.

Долар ЗША	1,9185	▼
Еўра	2,1129	▼
Рас. руб.	0,0305	▲
Укр. грыўня	0,0747	▲

■ Парламенцкі дзённік

ЦЯПЕР — ЗА ПРАЦУ!

Палата прадстаўнікоў завяршыла фарміраванне пастаянных камісій

Самымі шматлікімі сталі камісіі па міжнародных справах, па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, а таксама па адукацыі, культуры і навуцы. Таксама ўчора кожная пастаянная камісія абрала сваіх намеснікаў старшынь.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў, паставіў задачу замацаваць адказных дэпутатаў за тымі законапраектамі, якія ёсць у камісіях на разглядзе. Ужо зараз у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 36 законапраектаў.

І медык, і міжнароднік

Цікава, што некаторыя дэпутаты пятага склікання, якія перавыбраліся на другі тэрмін, пажадалі памяняць профільную камісію. Напрыклад, **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў пятага склікання па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ** перайшоў у Пастаянную камісію па міжнародных справах, дзе калегі абралі яго віцэ-старшынёй.

СТАР. 2

■ Паміж мінулым і будучым

СТАЎКА НА ГЕПАРДА

Як захаваць нацыянальную пароду коней

З даўніх часоў славяне 31 жніўня, у дзень святых Флора і Лаўра, заступнікаў коней, ушаноўвалі гэтых жывёл. У гэты дзень да іх ставіліся па-асабліваму: не выкарыстоўвалі нават для самай неабходнай работы, купалі, чысцілі, запляталі каляровыя стужкі ў хвост і грыву. Людзі аддавалі даніну павагі каню за яго вернасць і нялёгкую працу. Сяляне заўсёды з павагай адносіліся да яго, як да незаменнага памочніка.

Замежны госць — адзіны ў Беларусі.

Цяпер гэтая жывёла працягвае выконваць тыя ж функцыі, што і ў мінулым. Але ў святле навукова-тэхнічнага прагрэсу людзі імкнуцца цалкам механізаваць рабочы працэс і такім чынам палегчыць жыццё. На змену жывой сіле прыходзяць новыя сучасныя тэхналогіі і паступова адбываецца зніжэнне ролі каня. У Беларусі на гэты момант атэставаны і працуюць 19 племянных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў па конегадоўлі.

Каб даведацца, чым жыве гэтая галіна на Століншчыне, я наведала ААТ «Палеская ніва», што знаходзіцца ў аграгарадку Рамель. Развядзеннем коней беларускай запражной пароды тут займаюцца з 1999 года. Ініцыятыва стварэння племянной конефермы належала тагачаснаму старшыні гаспадаркі Мікалаю Ажогу. У 2005 годзе экспертная камісія Мінсельгасхарча пры правядзенні атэстацыі вынесла заключэнне аб прысваенні конефермe статусу племянной, бо яна адпавядала ўсім параметрам і стандартам па вырошчванні коней беларускай запражной пароды.

СТАР. 6

■ Сацыяльныя выплаты

Грошы для суіскальнікаў

Пачалася распрацоўка сістэмы страхавання ад беспрацоўя

Савет Міністраў даручыў стварыць міжведамасную рабочую групу па гэтым пытанні. Туды ўвайшлі спецыялісты міністэрстваў эканомікі, працы і сацыяльнай абароны, фінансаў, юстыцыі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, прадстаўнікі ад наймальнікаў.

Чакаецца, што праекты нарматыўных прававых актаў, якія будуць рэгуляваць дзейнасць страхавога фонду, распрацуюць у наступным годзе.

Дарэчы, ва ўрад ужо прадстаўлены праект указа аб удасканаленні захадаў сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый беспрацоўных. Ён прадугледжвае дыферэнцаванае павышэнне дапамогі па беспрацоўі і стыпендый тым, хто праходзіць навучанне па накіраванні службаў занятасці, да 50 і 100 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму. Нагадаем, што цяперашні максімум, які можа атрымаць чалавек, што стаіць на ўліку на біржы працы, складае дзве базавыя велічыні (гэта сума ў 42 рублі), а памер стыпендыі не перавышае тры базавыя (63 рублі).

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рэалізацыю Мінскіх дамоўленасцяў абмяркуюць у «нармандскім фармаце»

Сёння ў Берліне адбудзецца сустрэча ў «нармандскім фармаце», перадалі інфармагенцтвы са спасылкай на заяву ўрада Германіі. Удалося атрымаць згоду ад усіх чатырох удзельнікаў сустрэчы — канцлера Германіі Ангелы Меркель, прэзідэнтаў Украіны і Францыі Пятра Парашэнкі і Францыі Аланда, а таксама ад расійскага лідара Уладзіміра Пуціна. «Праз год пасля папярэдняй сустрэчы ў Парыжы 2 кастрычніка 2015 года канцлер запрасіла французскага, украінскага і расійскага прэзідэнтаў вечарам 19 кастрычніка ў Берлін, каб ацаніць рэалізацыю Мінскіх дамоўленасцяў з моманту апошняй сустрэчы і абмеркаваць далейшыя крокі», — адзначаецца на сайце ўрада Германіі.

Пятая частка насельніцтва Гаіці пацярпела ад урагану

Пятая частка насельніцтва Гаіці — 2,1 млн — пацярпела ад урагану «Мэцью», паведамляюць інфармагенцтвы. З іх больш за 1,4 млн маюць патрэбу ў тэрміновай дапамозе. Зафіксавана 510 выпадкаў халеры, некалькі дзясяткаў — са смяротным зыходам. Парушана праца больш як паловы медустаноў. З-за эпідэміі ўлады накіравалі ў дэпартамент Гранд-Анс 15 цыстэрнаў з хлараванай вадой, 116 тон нехарчовых тавараў і 134 тоны прадуктаў харчавання. Па звестках ААН, колькасць загінулых ад урагану ў Гаіці перавысіла 470 чалавек. Па іншых дадзеных — больш за 1 тыс.

Рыбалку не ўключаць у праграму Гульняў — 2020

Міжнародны алімпійскі камітэт (МАК) пакуль не плануе ўключаць спартыўнае рыбалоўства ў праграму Алімпійскіх гульняў. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе арганізацыі. У МАК паралелі ўсім федэрацыям, якія хочуць стаць часткай алімпійскага руху, для пачатку атрымаць адабрэнне і прызнанне «Спортак корда» (арганізацыя, якая аб'ядноўвае міжнародныя федэрацыі па відах спорту, уключаных і не ўключаных у праграму Алімпійскіх гульняў) і аналагічнай арганізацыі AIMS. 13 кастрычніка з'явілася інфармацыя, што Міжнародная канфедэрацыя спартыўнага рыбалоўства (CIPS) падала заяўку на ўключэнне гэтага віду спорту ў праграму Алімпійскіх гульняў — 2020 у Токіа. Дарэчы, на летніх Гульнях-1900 у Парыжы прайшлі неафіцыйныя спаборніцтвы па рыбалоўстве, у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі шасці краін. Запісаў пра пераможцу не захавалася.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Пачуццё гумару падаўжае жанчынам жыццё

Вучоныя з Нарвегіі прааналізавалі дадзеныя 53556 добраахвотнікаў. Спецыялісты хацелі высветліць, як пачуццё гумару ўплывае на верагоднасць смерці ад раку, хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх, сардэчна-сасудзістых і інфекцыйных захворванняў, піша The Times of India. Даследчыкі выявілі, што ў прадстаўніц прыгожага полу з добрым пачуццём гумару рызыка смерці па любых прычынах была зніжана на 48%. Акрамя таго, яны паміралі ад хвароб сэрца і сасудаў на 73% радзей, а ад інфекцыйных захворванняў — на 83% радзей. У мужчын пачуццё гумару памяншала верагоднасць смерці толькі ад інфекцыйных захворванняў (на 74%). Спецыялісты мяркуюць: магчыма, прадстаўнікі моцнага полу з узростам губляюць пачуццё гумару. Таксама вучоныя кажуць, што гармоны стрэсу, такія як картызон, негатыўна ўплываюць на імунную сістэму. А смех яе абараняе, не даючы ўзроўням гэтых гармонаў павышацца занадта моцна.

КОРАТКА

У Беларусі ў студзені—верасні бягучага года атрымальнікамі дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) сталі 220,7 тыс. чалавек — на 16,7% больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Аб'ём фінансавання на выплату ДАСД склаў за дзевяць месяцаў бягучага года Br52,6 млн.

Продаж інфармацыйнай прадукцыі без знака ўзроставай катэгорыі забароняць у Беларусі з 1 ліпеня 2017 года.

Кароткаметражны фільм «Брут», створаны пры ўдзеле беларускіх прадзюсараў, можа быць намініраваны на прэмію «Оскар» у катэгорыі «Лепшы ігравы кароткаметражны фільм».

Лагойск і Сілічы ўваходзяць у топ-10 самых папулярных у расіян гарналыжных курортаў СНД і Грузіі.

Упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі рэкамендуе загадзя паклапаціцца аб сезоннай змене шын. Згодна з ПДР, зімовую рызіну абавязкова выкарыстоўваць у перыяд з 1 снежня па 1 сакавіка, але ДАІ настойліва рэкамендуе гэта зрабіць ужо цяпер у сувязі з цяперашнімі ўмовамі надвор'я.

■ Жыллё

Суцэльнае зацішша

Істотнае зніжэнне попыту на другасным рынку сталіцы правакуе чарговае патанненне кватэр

Прыкладна з красавіка ў Мінску назіралася самая працяглая за апошнія пяць гадоў хваля пакупніцкай актыўнасці, у выніку якой на другасным рынку жылля быў пабіты дзесяцігадовы рэкорд па колькасці праведзеных здзелак. Аднак у верасні на гэтым сегменце рынку пачаўся незапланаваны «мёртвы сезон». Паводле інфармацыі аддзела аналітыкі аднаго буйнейшага са сталічных агенцтваў нерухомасці, колькасць заявак на куплю кватэр у верасні, у параўнанні са жніўнем, паменшылася на 20%. Зразумела, што гэта адмоўна паўплывала і на цэны самой нерухомасці.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ХАПУН» СКОНЧЫЎСЯ

Нагадаю, што напрыканцы лета прадаўцы, узрадаваныя ажыятажным попытам і зніжэннем канкурэнцыі (з рынку былі павымываныя самыя ўдалыя па спалучэнні цана-якасць аб'екты), нават злёгку паднялі цэны. Таму частка пакупнікоў вырашыла, што калі выбар скараціўся і цэны прапановы падраслі, значыць, гэта і ёсць цэнавае дно і больш нельга чакаць, а «трэба браць». Аднак такіх аказалася няшмат. Астатнія не захацелі плаціць даражэй, чым было ўчора. Таму з надыходам восені цэны ўжо больш не растуць, але масава і не зніжаюцца. Яны проста застылі ў нейкай нявызначанасці.

СТАР. 2

ЦЯПЕР — ЗА ПРАЦУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я — медык, узначальваю Беларускую асацыяцыю ўрачоў, і мы дастаткова доўга працуем і ў міжнародным кірунку, — патлумачыў ён журналістам сваё рашэнне. — У нас ёсць дагаворы аб супрацоўніцтве з рознымі краінамі — і з Расіяй, і са Славакіяй, і з Літвой, і з Латвіяй... Таму праца ў камісіі па міжнародных справах для мяне не новая. Я вырашыў, калі можна так сказаць, выйсці на якасна новы ўзровень. Планую супрацоўнічаць і з Міністэрствам замежных спраў, і з Міністэрствам аховы здароўя. Думаю, ад гэтага будзе карысць і нашаму парламенту ў цэлым, і нашай камісіі ў прыватнасці. Не толькі я, але і ўсе мае калегі прапаноўваюць свае ідэі. Склад камісіі ў нас вельмі добры, прыйшлі граматныя кіраўнікі, таму, думаю, будзе шмат прапаноў у тыя законапраекты, якія мы будзем разглядаць.

Ужо ў курсе спраў

Валянцін МІХНЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы, расказаў прадстаўнікам СМІ пра першыя тыдні дэпутацкай працы.

— Пераемнасць заўсёды была добрым задзелам плаўнага пераходу. Няма разрыву ў часе, пакуль людзі знаёмяцца з новым кірункам у працы. Тыя, хто застаўся з мінулага склікання, уводзяць нас у курс справы, дапамагаюць. Наша камісія ўжо правяла пасяджэнне, мы разгледзелі пытанні аб удзеле нашых дэпутатаў у мерапрыемствах розных арганізацый, у тым ліку і міжнародных. Такім чынам, мы паступова пераходзім да практычнага складніка нашай працы.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» пра тое, над якімі законапраектамі трэба будзе папрацаваць дэпутатам яго камісіі ў бліжэйшыя гады, Валянцін Міхневіч паведаміў, што пакуль у Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы ўсяго адзін законапраект, таму пра планы казаць рана.

Свая каманда

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК заявіла журналістам, што ў яе каманду ўвайшлі сапраўдныя прафесіяналы. Парламентарый асабіста пагутарыла з калегамі-дэпутатамі, што маюць юрыдычную адукацыю, і запрасіла іх далучыцца да працы ў камісіі па заканадаўстве. Такім чынам, Наталля Васільеўна ўжо ведае, з кім будзе працаваць наступныя чатыры гады, і глядзіць у будучыню з аптымізмам.

— Аляксандр Маркевіч быў кіраўніком Смаргонскай пагранбрыгады і мае адукацыю юрыста. Калі я з ім пагутарыла, то высветлілася, што ў яго ёсць вопыт практычнай працы. Ён, безумоўна, пагадзіўся ўвайсці ў нашу камісію. Кандыдат юрыдычных навук Максім Міско выкладае ў БДУ, ён жа з'яўляецца старшынёй Беларускага рэспубліканскага фонду міру, першапачаткова планаваў працаваць у міжнароднай камісіі, але мы з ім пагутарылі, і ў выніку ён перайшоў у камісію па заканадаўстве. Дэпутат можа працаваць і на міжнароднай арэне, незалежна ад таго, у якую камісію ён увахадзіць. Іван Маркевіч быў кіраўніком спраў Мінскага аблвыканкама. Гэта чалавек з велізарнейшым вопытам працы як са зваротамі грамадзян, так і арганізацыйнай. Упэўнена, што нават не маючы юрыдычнай адукацыі, ён абавязкова справіцца з працай у нашай камісіі. Віталь Уласевіч мае юрыдычную і эканамічную адукацыю, глыбока ведае правазнаўства і ў прынцыпе таксама можа прынесці вялікую карысць нашай камісіі.

Наталля Гуйвік паведаміла, што ўжо сёння ў камісіі ёсць восем законапраектаў.

— Адзін законапраект знаходзіцца ў распрацоўцы па ініцыятыве дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў пятага склікання — у тым ліку і мяне. Ён прысвечаны ўкараненню медыяцыі ў працэс вядзення крымінальнай справы, — удакладніла яна.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Суцэльнае заціша

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нават сёння асобныя прадаўцы сталічнага жылля ўпэўнены, што цэны на кватэры павінны павялічвацца мінімум да снежня, як было ў мінулыя гады. На гэты конт намеснік дырэктара па продажы на другасным рынку жылля групы кампаній «Твая сталіца» Святлана Кудзелка адзначае, што ўласнікі кватэр відавочна забываюць пра асноўны рынкавы карэктар цэнаўтварэння — баланс попыту і прапановы. А гэты паказчык цяпер зусім не на карысць росту цэн. Пачынаючы з верасня паралельна са зніжэннем попыту на рынку адзначаецца і павелічэнне колькасці прапанаваных на продаж кватэр. Паводле інфармацыі экспертаў, на сярэдзіну кастрычніка іх колькасць ужо на 3% перавышае аналагічны паказчык актыўнага ў плане правядзення здзелак жніўня. Разам з тым, колькасць праведзеных у верасні здзелак зменшылася адразу на 14%.

Самы танны квадратны метр прапаноўваўся сёлета ў «хрушчоўках» і «брэжнеўках», які ў рэальных здзелках складаў ад 1050 да 950 долараў.

МІНУС 0,2% — ТОЛЬКІ ЗА ТЫДЗЕНЬ

Спецыялізаваны партал нерухомасці Realt.by падлічыў, што за верасень і першую палову кастрычніка колькасць выстаўленых на продаж кватэр павялічылася на 4,9%, што адпавядае прыкладна 300 жылым памяшканням. Усяго ў агульнай базе сталічнай прапановы знаходзіцца 6664 аб'екты жыллёвай нерухомасці. Толькі за мінулы тыдзень прапанова падрасла ажно на 1%, дзе больш астатніх павялічыўся сегмент аднапакаёвых кватэр (плюс 3,4%). Праўда, двухпакаёвых кватэр на рынку стала крыху менш.

Зніжэнне попыту прывяло да таго, што за мінулы тыдзень сярэднія цэны прапановы паменшыліся на 0,2%. У выніку гэтага індэкс цэн на кватэры ў Мінску спыніўся на мяжы ў 1209 долараў за квадратны метр. Нагадаю, што ў маі і чэрвені гэты індэкс меў свой мінімум у дыяпазоне 1160—1170 долараў за «квадрат».

ЗНІЖКІ — ДА 20%

Разам з тым, спецыялісты рынку нерухомасці раяць арыентавацца на цэны прапановы толькі часткова. Сёння, як ніколі, на рынку прысутнічае сапраўды гнуткі торг. Велічыня зніжкі, якая прадастаўляецца рэальным пакупнікам, можа часам дасягаць 20%. Напрыклад, пры першапачатковай цане кватэры ў 50 тысяч долараў рэальны цэннік пагаднення атрымаецца на ўзроўні 42 тысяч долараў. Аналітыкі сталічнага рынку падлічылі, што пры сярэднім кошце аднапакаёвай кватэры 45,3 тысячы долараў, мінімальны цэннік рэальнай здзелкі складае каля 30 тысяч долараў. Па сегменце двухпакаёвых кватэр такая разбежка ў цэнах будзе вагацца ад 57,5 тысячы да 38 тысяч долараў, па трохпакаёвых — ад 80,5 тысячы да 59 тысяч долараў.

«БЮДЖЭТНІКІ» ТАННЕЮЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

Эксперты другаснага жыллёвага рынку Мінска правялі аналіз сярэдніх цэн квадратнага метра розных тыпаў кватэр менавіта па факце праведзеных здзелак у верасні. Самы дарагі «квадрат» аказаўся ў сучасных дамах ад 2000 года пабудовы палепшаных канструкцый (маналіт, каркас, блок) — 1335 долараў для аднапакаёвых кватэр і 1325 і 1285 долараў для двухпакаёвак і трохпакаёвак адпаведна. У свежых панэльных дамах (ад 2000 г. п.) квадратны метр кватэр ацэньваўся ўжо на ўзроўні 1155 долараў для аднапакаёвых кватэр, а для «двушак» і трохпакаёвак — 1120 і 1100 долараў.

Цэннік на квадратны метр у сапраўды «немаладых» дамах (1971—1999 г. п.) зніжаецца сёння ў першую чаргу. «Квадрат» такіх аднапакаёвых бюджэтных кватэр цяпер прадаецца за 1110 долараў, двухпакаёвак — за 1090, а трохпакаёвак — за 1040 долараў. Самы танны квадратны метр прапаноўваўся сёлета ў «хрушчоўках» і «брэжнеўках», які ў рэальных здзелках складаў ад 1050 да 950 долараў.

Зрэшты, не ўсе сегменты жылля паводзяць сябе аднолькава. Напрыклад, цэны на кватэры ў сучасных каркасна-блочных дамах ад 2009 года пабудовы сапраўды ўжо шосты месяц запар маюць невялікую, але станоўчую дынаміку. Але гэта тэндэнцыя ніяк не распаўсюджваецца на кватэры «старога» жылога фонду. Сёння нават «сталінкі» пачынаюць таннець.

За мінулы тыдзень на 0,3% патаннелі кватэры ў Брэсце, дзе квадратны метр прапануецца цяпер за 743 долары, у Гродне — 753 долары (мінус 0,5%), у Гомелі — 621 долар (мінус 0,1%), у Магілёве — 610 долараў (мінус 0,5%), Віцебску — 589 долараў.

І гэта яшчэ не ўсё. Аддзел эканомікі нашага выдання заўважыў адзін цікавы нюанс на другасным рынку сталічнага жылля. Намі разглядалася дынаміка змянення цэн прапановы ў разрэзе раёнаў сталіцы. Аказалася, што адразу ў шасці раёнах па выніках мінулага тыдня было адзначана зніжэнне цэн на кватэры. Тут максімальная карэкцыя назіралася ў Заводскім раёне, дзе цэны апусціліся ў сярэднім на 1%. Аднак у Кастрычніцкім, Маскоўскім і Партызанскім раёнах цэны прапановы працягвалі мінімальна павялічвацца. Пакуль павялічвацца...

Аналітыкі сталічнага рынку падлічылі, што пры сярэднім кошце аднапакаёвай кватэры 45,3 тысячы долараў, мінімальны цэннік рэальнай здзелкі складае каля 30 тысяч долараў.

СТАБІЛІЗАЦЫЯ ПЕРШАСНАГА РЫНКУ

Пачынаючы з сярэдзіны жніўня на сталічных новабудоўлях назіраўся рост цэн, якія за два месяцы прыплюсавалі больш за 3%. Аднак у кастрычніку сітуацыя змянілася і павелічэнне цэн спынілася. Сёння цана кватэр на першасным рынку стабілізавалася і трымаецца на ўзроўні 1170 долараў за квадратны метр. Эксперты рынку ўпэўнены, што арганізатары камерцыйнага будаўніцтва жылля і надалей будуць фарміраваць сваю цэнавую палітыку такім чынам, каб не адпалохваць патэнцыйных кліентаў. Бо апошнія могуць даволі хутка пераарыентавацца і на другасны рынак жылля.

ЦЭНЫ Ў РЭГІЁНАХ

«На жаль, у найбліжэйшы час для росту цэн на кватэры ў Беларусі няма і аб'ектыўных эканамічных перадумоў, — лічыць Святлана Кудзелка. — Даходы ў насельніцтва не растуць, а крэдыты па-ранейшаму масава недаступныя з-за высокай працэнтнай стаўкі. У наступныя некалькі месяцаў, пры захаванні бягучай эканамічнай сітуацыі, на рынку чакаецца стабілізацыя цэн прапановы, у той час як цэны здзелак з-за недахопу попыту могуць пайсці на зніжэнне».

Ужо традыцыйна па графіку Мінска, але з некаторым спазненнем вагаюцца цэны на жыллё і ў рэгіёнах. Так што і там не варта чакаць нейкага росту канчатковых цэнніка ў, упэўнены спецыялісты. У першую чаргу гэта тэндэнцыя на патанненне тычыцца абласных цэнтраў краіны. Напрыклад, за мінулы тыдзень на 0,3% патаннелі кватэры ў Брэсце, дзе квадратны метр прапануецца цяпер за 743 долары, у Гродне — 753 долары (мінус 0,5%), у Гомелі — 621 долар (мінус 0,1%), у Магілёве — 610 долараў (мінус 0,5%), Віцебску — 589 долараў (без змен).

У тэму

На другасным рынку Масквы за мінулы тыдзень сярэдняя цана прапановы стандартных кватэр павялічылася на 0,1% і склала 2 773 долары за квадратны метр. У Кіеве такое жыллё за гэты час наадварот патаннела на 0,2%, сярэдні кошт «квадрата» стаў 1431 долар. На першасным рынку Кіева цана кватэр у доларавым эквіваленце знізілася яшчэ мацней (мінус 0,8%) і складае 845 долараў за квадратны метр.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

У машынабудаванні адкрываецца другое дыханне?

У рамках наведвання беларускай дэлегацыяй на чале з Прэзідэнтам Кітая і Пакістана было падпісана нямала важных для Беларусі дакументаў. Шэраг з іх пазітыўна паўплывалі на прамысловы комплекс нашай краіны. Паводле слоў міністра прамысловасці Віталя ВОЎКА, у Паднябеснай былі падпісаны дакументы, якія ўжо ў хуткай будучыні дазволяць сур'ёзна нарасціць вытворчыя магутнасці па новых кірунках.

Згодна з адным з такіх пагадненняў з карпарацыяй Weichai Power Co.Ltd, плануецца рэалізаваць праект па стварэнні ў Беларусі вытворчасці дызельных рухавікоў. Рабочыя групы для аналізу праекта вызначаны, а будаўніцтва завода запланавана ў індустрыяльным парку «Вялікі камень». Кітайскія рухавікі ўжо выкарыстоўваюцца на МАЗе. Яны сертыфікаваны па экалагічных класах Еўра-4 і Еўра-5, ёсць і мадэлі Еўра-6. Іх магутнасць складае ад 10 да некалькіх тысяч конскіх сіл. Па разліках Міністэрства прамысловасці, каапэрацыя з кітайскімі партнёрамі дазволіць Беларусі мець закончаны цыкл па стварэнні сілавога агрэгата — рухавіка, счаплення, каробкі перадач. Такім чынам, у машынабудаўнікоў не будзе неабходнасці закупляць рухавікі за мяжой, як гэта робіцца цяпер.

Па словах Віталя Воўка, Мінпрам і кітайская кампанія Zoomlion таксама намераны рэалізаваць шэраг сумесных праектаў у машынабудаванні. Падчас візіту два бакі падпісалі дарожную карту супрацоўніцтва на доўгатэрміновую перспектыву. У яе ўключаны МАЗ, МТЗ, «Гомсельмаш», магілёўскі завод «Строммашына». Кампанія плануе адкрыць у Беларусі вытворчасць пажарных вышак з падачай вады на 50 м і вышэй і пажарных машын. Акрамя таго, «Гомсельмаш» і кітайская кампанія абмяняюцца тэхналогіямі. Малыя камбайны, якіх у нас у лінейцы няма, будуць асвойвацца ў Беларусі. У сваю чаргу нашы вялікія камбайны, як, напрыклад, 1218, 1624, а таксама кормаўборачная тэхніка будуць пастаўляцца для кітайскага рынку.

Таксама падпісаны мемарандумы аб намерах паміж Мінпрамам і Усекітайскай аэракасмічнай карпарацыяй навукі і прамысловасці, паміж БелАЗам і кітайскай кампаніяй «Санцзян». Вынікам павінна стаць вытворчасць цяжкіх самазвалаў на тэрыторыі Кітая. Акрамя таго, міністр прамысловасці адзначыў, што з кітайскімі партнёрамі абмяркоўваецца магчымасць супрацоўніцтва па стварэнні водных скутараў, установак па транспарціроўцы звадкаванага газу.

Як адзначыў **дырэктар па інавацыях і інвестыцыйных праектах кіруючай кампаніі холдынга «Амкадор» Ігар КАЮДА**, на прадпрыемстве плануецца да канца гэтага года пачаць рэалізацыю трох буйных кантрактаў з карпарацыямі CITIC Group і Sinomach. Гаворка ідзе пра будаўніцтва завода «Амкадор-Маш» у пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна па вытворчасці спецтэхнікі — франтальных пагрузчыкаў, энерганасычаных трактароў магутнасцю ад 300 да 500 конскіх сіл з выкарыстаннем кітайскага крэдыту ў памеры 230 млн долараў. Астатнія кантракты датычацца мадэрнізацыі двух заводаў кампаніі-партнёра холдынга «Салея» ў Кобрыне і Гомелі на агульную суму ў 170 млн долараў. Таксама на «Амкадоры» акрамя гэтага плануюць рэалізацыю праекта па выпуску экскаватараў. Калі перамовы з кампаніяй Sinomach, якія вяліся на працягу года, будуць паспяховымі, партнёры пачнуць стварэнне сумеснага завода па выпуску экскаватараў на базе «Амкадор — Коханаўскі экскаватарны завод».

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■

ГАРАЧЫЯ ТЭЛЕФОНЫ

У суботу, 22 кастрычніка, Мінгарвыканкам і аблвыканкамы традыцыйна правядуць прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на званкі жыхароў краіны будуць адказваць:

Брэсцкі аблвыканкам
кіраўнік спраў НАРКЕВІЧ Юрый Іосіфавіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

ПА ПЕРАМОГУ — У ВЯЛІКІ НОЎГАРАД

Заключны этап алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» пройдзе з 23 па 28 кастрычніка ў Вялікім Ноўгарадзе.

Плануецца, што ў заключным этапе алімпіяды будуць удзельнічаць 192 беларускія і расійскія школьнікі. Арганізатарамі алімпіяды выступаюць Міністэрства адукацыі і навукі Расіі і Міністэрства адукацыі Беларусі. У 2015 годзе абсалютным пераможцам дзясятай алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» стала Вікторыя Сцепанюк, навучэнка клімавіцкай сярэдняй школы №3 Магілёўскай вобласці.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Трактор МТЗ-80Л, год выпуска 1993, № рамы (VIN) 898484, трактор колесный универсально-пропашной с колесной формулой 4*2, цвет – синий, полная масса – 4400, двигатель – дизель, 4 цилиндра, 4750 см. куб., 60 kw, 81 л.с.
Начальная цена продажи	2 236,79 р. (две тысячи двести тридцать шесть рублей семьдесят девять копеек) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	224 р. (двести двадцать четыре рубля)
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика	автомобиль МАЗ 5337А2-341, 2008 г.в., № рамы (VIN) Y3M5337A280000767, кузов грузовой специальный цистерна, цвет – белый, формула 4*2, полная масса 18 000, двигатель – дизельный 6 цилиндровый 11150 см. куб. 169kw 230 л.с., ЯМЗ-236НЕ-2, пробег 256351 км.
Начальная цена продажи	17 920,79 р. (семнадцать тысяч девятьсот двадцать рублей семьдесят девять копеек) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	1792 р. (одна тысяча семьсот девяносто два рубля)
Условия аукциона	Без условий
Продавец	ОАО «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, 8-0154-550-808
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	100 % предоплата за приобретаемый объект
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 21 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам - документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица - доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник - четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений - 15 ноября 2016 г. до 15.00	
Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/	

Утерянную печать садового товарищества «Тарасик» Борисовского района считать недействительной.

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон +375 17 283 28 28

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016	2015
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		26 549	31 821
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		399	395
4	Средства в Национальном банке	1103		12 674	28 548
5	Средства в банках	1104		20 913	38 627
6	Ценные бумаги	1105		121 490	27 766
7	Кредиты клиентам	1106		132 650	126 734
8	Производные финансовые активы	1107		9	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		2	2
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		29 825	24 686
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		1 694	2 242
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		10 239	3 897
14	**ИТОГО активы**	11		356 444	284 718
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	5 029
17	Средства банков	1202		20 842	33 234
18	Средства клиентов	1203		272 330	188 695
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		2 877	611
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		3 649	4 075
23	**ВСЕГО обязательства**	120		299 698	231 644
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		11 462	11 199
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		5 150	1 730
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		18 584	18 573
29	Накопленная прибыль	1215		21 550	21 572
30	**ВСЕГО собственный капитал**	121		56 746	53 074
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	12		356 444	284 718

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2016 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016	2015
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		23 274	22 086
2	Процентные расходы	2012		11 489	8 895
3	**Чистые процентные доходы**	201		11 785	13 191
4	Комиссионные доходы	2021		8 933	8 323
5	Комиссионные расходы	2022		2 497	1 636
6	**Чистые комиссионные доходы**	202		6 436	6 687
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		37	29
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		88	199
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		8 412	8 542
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		9	(278)
11	Чистые отчисления в резервы	207		8 362	11 603
12	Прочие доходы	208		4 671	1 549
13	Операционные расходы	209		19 526	14 847
14	Прочие расходы	210		1 126	1 024
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		2 424	2 445
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		-	201
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	2		2 424	2 244

Председатель Правления Д.Л.Михалевич

Главный бухгалтер Н.А.Кузьмицкая

Дата подписания «11» октября 2016 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта: https://tb.by/about/bank/finance/

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г.
УНП 100706562

■ Будзь у курсе!

Рэгістрацыя шлюбу ў памятным месцы?

Такая паслуга ўваходзіць у пералік платных

Урад пашырыў пералік дадатковых платных паслуг, што аказваюцца органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 15 кастрычніка 2016 года №826. Яна ўступае ў сілу з 1 студзеня наступнага года.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэтыя платныя паслугі аказваюцца аддзеламі запісу актаў грамадзянскага стану раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў і мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, Дамамі (Палацамі) грамадзянскіх абрадаў гарадскіх выканаўчых камітэтаў, пасялковымі і сельскімі выканаўчымі і распарадчымі органамі, консульскімі ўстановамі, а таксама дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Беларусі ў выпадку выканання імі консульскіх функцый.

Пастанова дэталізуе парадак аказання паслуг урачыстай абстаноўкі рэгістрацыі заключэння шлюбу або рэгістрацыі нараджэння. Рэгістрацыю шлюбу можна правесці па індывідуальным сцэнарыі з выкарыстаннем розных элементаў і атрыбутаў па-за памяшканнем загса. Месцам цырымоніі могуць быць памяшканні ўстаноў культуры, памяшканні, размешчаныя ў гістарычных і памятных месцах, тэрыторыя аб'ектаў, якія з'яўляюцца помнікамі гісторыі ці архітэктуры, архітэктурныя ансамблі, бальніцы, уласнае месца пражывання і інш.

Дадаткова замацавана магчымасць загсаў праводзіць цырымоніі, прысвечаныя памятным датам шлюбнага жыцця («сярэбранае» вяселле, «залатое» вяселле і інш.). Мясцовым Саветам дэпутатаў рэкамендавана пры неабходнасці накіроўваць грошы, атрыманыя ад аказання дадатковых платных паслуг органамі загса, на ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

■ Гэта па-нашаму

«Беларусам быць модна!»

Пад такім хэштэгам выкладае здымкі ў інстаграм 23-гадовая мадэльер Ганна-Марыя Эгліт. На фота — стройныя дзяўчаты ў прывабных сукенках з беларускім арнаментам

Ганна сустрэла нас у сукенцы, пашытай уласнаручна.

Што цікава, калекцыю ў нацыянальным стылі Ганна пашыла зусім выпадкова. На пачатку лета да яе звярнуўся фларыст Ігар Пелагейчык і прапанаваў апрануць сваіх мадэляў да фестывалю памяці Янкі Купалы ў Вязынцы. Яму не хацелася браць рэквізіт у тэатрах. Дзяўчына падумала: а чаму б і не? І сшыла за два тыдні 40 льняных сукенак. З вышыўкай ёй дапамог майстар з Дзяржынска.


«Перш чым адкрыць сваё атэлье і наняць швачак, я сама павінна прайсці ўсе прыступкі»

«Лепш быць прыгожым дызайнерам, чым проста мадэллю»

На днях мы завіталі ў госці да Ганны-Марыі.

— Менавіта тут, у сваёй кватэры, я адшыла ўжо тры калекцыі адзення, — з усмешкай сустрэла нас Ганна. — Вось на гэтых дзвюх швейных машынках *(паказвае)*. Мне іх мама падарыла на дзень нараджэння два гады таму. Калі шчыра, я раней і падумаць не магла, што буду шыць з ільну *(падыходзіць да манекена, апранутага ў ільняную сукенку)*. Мне заўсёды была бліжэй тканіна, якая не камечыцца. Абажаю футра, штучную скуру пад латэкс — гэта наогул касмічна... Ды і калі вучылася ў каледжы, я вельмі баялася працаваць з ільном. Гэта дастаткова сыпучы матэрыял, вельмі цяжкі ў апрацоўцы. Але паспрабавала — і мне спадабалася. Асабліва, як вышыўка глядзіцца на льне! Гэта якраз той момант, калі ты думаеш, што ніколі чымсьці займацца не будзеш, а пачынаеш — і ўлюбляешся...

З 40 сукенак з той вязынскай калекцыі мы змаглі ўбачыць «ужывую» толькі 6. Астатнія ўжо знайшлі сваіх гаспадынь. На пытанне, куды іх можна насіць, мадэльер, не раздумваючы, адказвае:

— Ды куды заўгодна! У такіх сукенках з вышыўкай не сорамна і ў кавярню з хлопцам схадзіць, і ў клуб на дыскатэку. Калі шыю, я ў першую чаргу арыентуюся на дзяўчат свайго ўзросту. Пакуль мы маладыя, можам пахваліцца стройнымі ножкамі, ручкамі... У Беларусі вельмі прыгожыя дзяўчаты. Мая задача як дызайнера — дапамагчы падкрэсліць прыгажосць. Таму стараюся шыць сексуальныя, кароценькія сукенкі, але, галоўнае, каб пры гэтым яны не былі вульгарнымі.

Ганна прызналася, што сама з задавальненнем носіць свае сукенкі з вышыўкай. Дарэчы, у адной з іх яна нас і сустрэла.

— Не *(смяецца)*, мне яе малодшы брат падарыў пазалетась, на дзень нараджэння. Уся сям'я сядзела за сталом, ён падымаецца і кажа: «Аня, ты памятаеш?.. Сшый ёй сукеначку!» Бачыце, не змагла ўтрымацца, сшыла *(смяецца)*.

У каледжы, калі ўсе вучылі матэматыку і фізіку, Ганна ўжо пачала маляваць сваю першую калекцыю.

— Мама хацела, каб пасля каледжа я паступіла ва ўніверсітэт, але я пайшла працаваць. Дзесьці год шыла вясельныя сукенкі. Я вельмі любіла ўсю гэтую прыгажосць, шык... А потым паехала ў Індыю на 3 месяцы. Калі вярнулася, вырашыла паспрабаваць уладкавацца на «Мілавіцу». Там мне прапанавалі намаляваць калекцыю піжам. Далі на ўсё гэта тыдзень. Я так хацела, каб мяне ўзялі, што не толькі намаляавала, але і купіла тканіну, з якой яны працавалі, і пашыла калекцыю. Калі прынесла, мне сказалі «малайчына, але мы не можам узяць цябе на працу без вышэйшай адукацыі»...

Я не здалася. Дзеля сваёй мары прадала любімую машыну і паехала ў Кітай. Сябры, якія вучыліся ў Гуанчжоў, параілі мне паглядзець узровень гэтага перадавога горада свету. Я паехала і ўбачыла маштабы. Толькі ўявіце, там адной толькі тканіны — як усё наша Уручча. Я два тыдні з ранку да вечара хадзіла па тым рынку, брала ва ўсіх візітоўкі. Шукала пастаўшчыкоў, каб мне прывозілі матэрыял, якога няма ў горадзе. Я не хацела працаваць з тканінай, якую можа ўзяць іншы дызайнер. Гэта ўжо не эксклюзіўна.

...Працаздольнасць і мэтанакіраванасць Ганны, калі шчыра, здзіўляе. Прайшло зусім мала часу, а яна заканчвае чацвёртую ўласную калекцыю. Ваўсю рыхтуецца да беларускага Тыдня моды, які пройдзе напачатку лістапада. Кажа, ёй так запала ў душу вышыўка, што нават у цёплыя рэчы ўмудрылася дадаць крыху нацыянальных матываў.

«Не ўяўляю, як бы я апранула кітайцаў»

Ганна пачынае пазіраць на гадзіннік. Нядаўна яна ўладкавалася на працу ў звычайнае атэлье — рамантуе і падшывае кліентам адзенне штодзень з адзінаццаці гадзін дня да васьмі вечара.

— Ужо год я жыву ў цудоўным раёне, на праспекце Пераможцаў, непадалёк ад вадасховішча Дразды. І працу знайшла за дзвесце метраў ад дома. У гэтым раёне жыве шмат маіх знаёмых. Калі яны ўбачылі, што працую ў атэлье, падумалі, што гэта я ўжо сваё адкрыла. Па шчырасці, быў момант, калі я сказала маме: «Мама, давай адкрыем атэлье, калі ласка, ну, проста паспрабуем». «Калі хочаш, адкрывай, дам табе грошы, але ідзі сама ў падатковую, даведвайся як і што...», — пачула ў адказ. І вось тады я зразумела, што яшчэ не зусім гатова наймаць людзей, што магу заваліць усю справу. ...Вы не ўяўляеце, як гэта цяжка — сядзець і ўвесь час шыць. Спіна баліць, рукі сколатыя. Як дзяўчына, разумею: да 25 гадоў я так яшчэ згодна папрацаваць, набрацца вопыту. А пасля адкрыю сваё атэлье і найму іншых людзей. Але каб штосьці ад іх патрабаваць, я павінна сама прайсці праз усе прыступкі.

Такія абноўкі дзяўчына можа смела надзець, каб звярнуць на сябе ўвагу хлопцаў.

Лён выглядае модна і дорага.

— *Як ты знаходзіш на ўсё час? Па начах шыеш?*

— У мяне няма такога, што не хапае часу. Часу хапае заўсёды, калі ёсць мэта. Раней я любіла спаць, магла цэлую ноч тусавацца ў клубах, а пасля спаць да абеду. Я нават заняткі ў каледжы прапускала з-за гэтага, і мела праблемы. Але аднойчы прачнулася і зразумела: усё, хопіць спаць. Трэба займацца справай.

Планы ў дзяўчыны сапраўды грандыёзныя. І ўсе яны звязаны з Радзімай. Ганна прызналася, што вельмі любіць Беларусь і нікуды не хоча адсюль з'язджаць.

— Мне тут вельмі камфортна. Я жыву адна (дакладней, з катом Смогам), паступіла ў віцебскі ўніверсітэт на бюджэт, вучуся і працую на сябе: індывідуальных заказаў хапае. Калі шчыра, не ўяўляю, як бы я апранула кітайцаў. У іх там настолькі шмат адзення (і каштуе яно капейкі), што яны набываюць часта новае і выкідваюць старое. Беларусы так не робяць. Калі купяць, то будуць насіць бераўліва, акуратненька. Я не хацела б, каб мае сукенкі былі аднадзёнкамі — купіў і выкінуў. У будучым мару зрабіць калекцыю ніжняй бялізны, вельмі люблю гэту тэму.

— *А Ганна-Марыя Эгліт — гэта тваё сапраўднае імя?*

— Так. Калі не верыце, магу пашпарт паказаць *(смяецца)*. Мяне бацькі назвалі Аняй, а хрысцілі Марыяй. Эгліт — прозвішча прабабулі з Латвіі. Яе таксама Ганнай звалі. Яна, дарэчы, цудоўна шыла, нейкі час на аршанскай фабрыцы працавала. Калі мне споўнілася 18, вырашыла ўзяць сабе прозвішча прабабулі. Па-першае, яно больш гучнае. Па-другое, бацькава прозвішча раскручана ў іншых колах. А я хачу самастойна зрабіць сабе імя.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН і з архіва гераіні

■ Дарогамі гісторыі

ПРЫЧАЛІЦЬ У... МІНСКУ

Вывучаем мінулае воднай сістэмы

Вы ведаеце, што нават праз стагоддзе, калі добра прыгледзецца, можна выявіць месцазнаходжанне даўно высахлага ручая? І што да гэтага часу вядуцца спрэчкі пра тое, дзе на самай справе была летапісная Няміга? А што Свіслач цяпер значна чысцейшая, чым у канцы XIX стагоддзя? Дык давайце ж адправімся ў захапляльнае падарожжа па воднай роўнядзі сталіцы.

У КРУІЗ ПА СТАЛІЦЫ

Усім вядома, што адна з шырока распаўсюджаных неафіцыйных назваў нашай краіны — Сінявокая. Падзякаваць за такі паэтычны тапонім можна ледавікам, якія 5 разоў пакрывалі тэрыторыю Беларусі. Пасля апошняга абледнення, якое скончылася 14 тысяч гадоў таму, водная сістэма доўгі час не перажывала істотных пераўтварэнняў. Усё змянілася, калі чалавек вырашыў узяць кіраванне прыроднымі рэсурсамі ў свае рукі. У 1960—1970-х гадах была праведзена масавая меліярацыя палескіх балот. Гэта памылковае рашэнне ў спалучэнні са зменай кліматычных фактараў — глабальным пацяпленнем — прывяло да абмялення рэк і скарачэння агульнай колькасці водных артэрый.

Як адзначыў **даследчык мінскай воднай сістэмы Андрэй КУЛЬША,** гэтая праблема закранула і сталіцу, дзе, акрамя таго, асабліва моцны ўплыў гаспадарчай дзейнасці. Значная частка водных рэсурсаў ідзе на задавальненне патрэб жыхароў горада, а таксама выкарыстоўваецца ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў. Для таго, каб дакладна ўстанавіць, дзе раней знаходзіліся ўжо зніклыя або тыя, якія памянялі сваё рэчышча, рэкі і ручаі, выдатна падыходзяць нават непадрабязныя гістарычныя карты. Паколькі ўсе масты лічацца стратэгічна важнымі ваеннымі аб'ектамі, нават калі самой дробнай рэчкі на карце няма, гэта збудаванне на ёй хутчэй за ўсё будзе адзначана.

Галоўная водная артэрыя горада — рака Свіслач — бярэ свой пачатак за 39 кіламетраў на паўночны захад ад сталіцы на Мінскім узвышшы. Вусце ракі пралягае па тэрыторыі штучна створанага Заслаўскага вадасховішча (Мінскага мора). Дасведчаныя рыбакі ведаюць, дзе менавіта раней працякала рака, бо там больш глыбокія месцы, цудоўна прыдатныя для лоўлі рыбы. У верхнім цячэнні Свіслачы на перасячэнні з сучаснай мяжой Мінска ў яе раней упадала рака Дзеравелка. Нават цяпер на стадыёне непадалёк ад станцыі метро «Каменная Горка» можна знайсці сляды былога вусця. Акрамя таго, на гістарычнае мінулае паказваюць дрэвы, якія там растуць. Часцей за ўсё паблізу ракі ці ручая ёсць падземная крыніца, якая пакідае пэўныя пазнакі на зямлі.

Па левым беразе ў Свіслач раней упадала рака Пярэспа, якая цяпер заключана ў падземны ліўневы калектар. Дарэчы, з ёй звязана адна з галоўных гарадскіх легендаў, паводле якой на месцы ўпадзення Пярэспы ў Свіслач волат Мяneск пабудаваў свой млын. Цікавы тапонім, на шчасце, не знікне разам з рэчкай: так будзе названа новая станцыя метро на скрыжаванні праспекта Машэрава і вуліцы Крапоткіна.

Адным з самых буйных прытокаў Свіслачы на тэрыторыі Мінска з'яўляецца рака Лошыца. У верхнім цячэнні яна раздвойваецца і адзін з прытокаў носіць забаўную назву Мышка, але некаторыя гэты факт ставяць пад сумнне і называюць Мышку Мухляй. Гэты тапонім, дарэчы, пайшоў ад прозвішча мінскіх татараў, якія займаліся распрацоўкай гліняных кар'ераў, каб здабыць матэрыял для сваіх цагляных заводаў. Пазней закінутыя кар'еры напоўніліся вадой і ўтварыліся штучныя азёры, якія і атрымалі назву Мухля. Цяпер пад такой назвай многія гараджане ведаюць вадаём у парку імя Паўлава.

Нягледзячы на спробы чалавека цалкам падпарадкаваць сабе прыроду, часам яна ўсё ж настойліва заяўляе аб сваіх правах. Адным з прыкладаў такой актыўнай барацьбы з'яўляецца будаўніцтва метро. Часцей за ўсё пры ўзвядзенні новых станцый рэкі і ручаі аказваюцца над імі, аднак сустракаюцца і рэдкія выключэнні. У некаторых выпадках бясконцыя старанні справіцца з падземнымі крыніцамі аказваюцца марнымі. Напрыклад, адзін з бакоў станцыі метро «Магілёўская» вельмі прыцемнены. Гэта абумоўлена адной простай прычынай: ён увесь час заліваецца вадой і падцёкі выглядаюць вельмі неэстэтычна. З такой жа праблемай сутыкнуліся і работнікі станцыі «Маладзёжная», паблізу якой знаходзіцца ваданосны гарызонт. А пра патопы, якімі «славіцца» Няміга, лепш нават і не ўспамінаць.

НЯМІГА: СТРАЧАНЫЯ СЛЯДЫ

Дарэчы, пра Нямігу. З дзяцінства ў школе ўсіх навучалі, што першыя ўпамінанні Мінска звязаны з бітвай на рацэ Нямізе, якую кожны разумова суадносіў з раёнам з адпаведнай назвай. Аднак даследчыкі так і не прыйшлі да адзінага меркавання, ці тая гэта Няміга, якая згадвалася ў «Слове аб палку Ігаравым».

Існуе думка, што Няміга была штучна створаным ровам, які акружаў замчышча. На карысць такога меркавання сведчыць тое, што з балцкіх моў гэта слова перакладаецца як бессань. Тлумачэнне такое: каля рова дзяжурылі вартавыя, якім нельга было спаць — адсюль і назва. Дарэчы, у літоўскай мове і цяпер выкарыстоўваецца гэтае слова. Ёсць і больш неверагодныя версіі: некаторыя, паказваючы на сугучча, спрабуюць Нямігу прадставіць як адну з назваў Нёмана.

Вядомы **краязнаўца Павел РАСТОЎЦАЎ** вывучыў мноства картаў розных гадоў, каб наблізіцца да разгадкі гэтай таямніцы. Як аказалася, гідронім Няміга ўпершыню пасля 1067 года сустракаецца ў дакументах аж у 1837 годзе. Да гэтага пад такой назвай была вядома толькі вуліца. Хутчэй за ўсё, калі ручай (малаімаверна, што гэта была рака) і існаваў, то быў настолькі дробным, што нават не заслугоўваў увагі картографаў. Першы план, на якім Няміга паказана цалкам, пачынаючы ад вытоку ў раёне вуліцы Вірскай, датуецца 1910 годам.

Аднак з праблемай затапленняў Мінск сутыкнуўся яшчэ ў XIX стагоддзі. Напрыклад, з 1880 па 1914 год было разгледжана 12 спраў са зваротамі жыхароў да гарадскіх улад аб падтапленні іх дамоў і, кажучы сучаснай мовай, офісаў. На фотаздымках пачатку XX стагоддзя відаць вузкая канава, якая не надта паспяхова выкарыстоўвалася як ліўневы сцёк — цяжка паверыць, але гэта і ёсць Няміга. Убачыць раку ў яе натуральным выглядзе цяпер нельга, бо яна ў 1926 годзе была пушчаная па створаным яшчэ цалкам уручную падземным калектары.

ВУСЦІШНАЯ СВІСЛАЧ. ЧАМУ РЭЧКУ ЛЕПШ БЫЛО АБЫХОДЗІЦЬ БОКАМ?

Нядаўна жыхары сталіцы праводзілі генеральную прыборку поймы галоўнай ракі горада, за што ў якасці ўзнагароды атрымалі бясплатную прагулку на параходзе. Раней такіх павабных акцый не было, мабыць, таму ніхто асабліва не сачыў ні за чысцінёй набярэжнай, ні за чысцінёй самой ракі.

Як сцвярджае **краязнаўца Вадзім ЗЕЛЯНКОЎ,** які даследаваў справаздачы галоўных санітарных лекараў горада, стан Свіслачы ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя быў надзвычай дрэнным. Пры гэтым магчымасці воднай прасторы выкарыстоўваліся па максімуме. Каб сэканоміць час на нашэнні вады, многія жанчыны з размешчаных блізка да ракі дамоў мылі бялізну проста ў ёй. Аднак мылі не толькі адзенне, акуналіся і самі. На паштоўках таго часу можна ўбачыць не самыя прывабныя гарадскія купальні, якіх у горадзе было чатыры, але пасля з прычыны забруджанасці дзве з іх былі зачынены.

А як ім не быць забруджанымі, калі па жалабах, якія ішлі ўздоўж гарадскіх вуліц, з-за ўзгорыстага рэльефу ўсе не надта чыстыя воды сцякалі ў раку. Але калі б толькі воды! У Свіслачы аказваліся і памыі, і адпрацаваныя матэрыялы вытворчасці з піўнога завода Лекерта, і нават часткі туш памерлых жывёл. Як вынік, «падобны на шматкі, жоўта-буры асадак, рэакцыя шчолачная, мікраскапічны аналіз паказаў наяўнасць у вадзе вялікай колькасці круглых чарвякоў і караняножак».

Тэрыторыя цяперашняй вуліцы Кастрычніцкай, якая зараз знакамітая сваімі яркімі графіці, раней вылучалася наяўнасцю адразу пяці гарбарных заводаў. У выніку праверак гэтых прадпрыемстваў была выяўлена добра замаскіраваная труба, праз якую адходы паступалі наўпрост у раку. Пры гэтым на другім беразе знаходзіліся казармы, а значыць, салдаты, нічога не падазраючы, выкарыстоўвалі для мыцця ядавітую ваду. Яшчэ ніжэй па цячэнні ракі знаходзіліся гарадскія бойні. Фільтры ўяўлялі сабой сеткі, якія затрымлівалі толькі буйныя часткі забітых жывёл, усё астатняе без перашкод аказвалася ў рацэ.

Знакаміты канфлікт звязаны з Плябанскімі млынамі, якія знаходзіліся на беразе Свіслачы з XVII да пачатку XX стагоддзя. У раёне сучасных парку імя Янкі Купалы і сквера Марата Казея рака была перагароджана плацінай, неабходнай для работы млыноў. Тэрыторыя на адным беразе належала праваслаўнаму духавенству, на другім — каталіцкаму. Некалькі стагоддзяў яны не маглі дамовіцца аб тым, каму належыць рыба. Аднак у пачатку XX стагоддзя канфлікт перакінуўся ўжо на гарадскія ўлады: з-за плаціны ўтварылася запруда, вада была стаячай, а значыць, бруднай. Нягледзячы на настойлівыя просьбы санітарных службаў прыбраць плаціну, з-за ўпартасці ўладальнікаў праблему не ўдавалася канчаткова вырашыць да савецкіх часоў.

Як аказалася, сучасны стан воднай сістэмы — гэта «яшчэ кветачкі». Аднак гэта не падстава для гонару, а прычына яшчэ больш старанна сачыць за чысцінёй, каб справа зноў не дайшла «да ягадак».

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

Фота БЕЛТА.

■ Пытальнік

І ЗНОЎ ПРА АДКЛЮЧЭННЕ ПРАВАДНОГА РАДЫЁ

Чарговыя заяўнікі з гэтай нагоды — жыхары сталіцы

Паважаныя супрацоўнікі рэдакцыі! Просім патлумачыць нам, пенсіянерам, і дапамагчы разабрацца ў пытанні: чаму адключылі радыё? Без папярэджання, без парады і пажаданняў тых, хто ім карыстаўся. І зрабілі гэта ў самае свята Дня пажылых людзей — 1 кастрычніка. Для нас радыё — гэта эліксір жыцця, аддушына. Мы з ім нарадзіліся, раслі і вучыліся працаваць, будаваць, перамагаць, моцна сябраваць і разумець адно аднаго. Цяпер мы проста адарваныя ад свету, знаходзімся ў разгубленасці... Спадзяемся, што вы нам дапаможаце.

Е.І. ФІДЗІРКА, Н.Г. КУЧЫНСКАЯ, Л.Г. КРАШЧОНА, г. Мінск

Упэўнена, што тысячы пенсіянераў абураюцца такім рашэннем, толькі многія ўжо не ў стане напісаць. Канешне, цяпер час камп'ютараў, але гэта для моладзі. А нам мілыя сэрцу ранейшыя песні, спектаклі, радыёпастаноўкі — усё, што мы слухалі па беларускім радыё. З ім мы засыналі і прачыналіся. Каштавала гэта капейкі. А цяпер ці шмат тых капеек у пенсіянераў?..

Ларыса Іосіфаўна ПАПОВІЧ, г. Мінск

Невыпадкова, што ўсе аўтары заяў — мінчане. І раней у рэдакцыю паступалі звароты грамадзян з адной пэўнай мясцовасці — адтуль, дзе ў бліжэйшы час планавалася або ўжо адбылося адключэнне праваднога радыё. У сталіцы яно сапраўды перастала працаваць з 1 кастрычніка. І гэта дата — не больш чым супадзенне з Днём пажылых людзей, паколькі графік адключэння быў зацверджаны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі яшчэ чатыры гады таму. У адпаведнасці з «Планам мерапрыемстваў па паэтапным адключэнні праваднога вяшчання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», на першым этапе да канца 2014 года такія работы праводзіліся ў раённых цэнтрах і сельскіх населеных пунктах краіны. 1 жніўня гэтага года праваднае радыё было адключана ў Брэсце, Віцебску, Гродне і Гомелі. Да 1 кастрычніка гэта павінна было быць зроблена ў Магілёве і Мінску. Як бачна, нельга сказаць, што працэс адключэння быў раптоўным і адначасовым паўсюдна. І інфармацыя пра гэта перыядычна даводзілася да ведама грамадзян, у тым ліку і праз наша выданне.

Прычыны адключэння, думаецца, цудоўна ведаюць і самі нашы заяўнікі: меры прымаліся ў сувязі са зніжэннем колькасці абанентаў. Ды і тэхналогія прадастаўлення паслугі ўжо састарэла. Падтрымліваць у належным стане праваднае радыё цяжка з-за таго, што вытворчасці некаторых дэталяў ужо няма. Канешне, па-чалавечы можна зразумець людзей, якія дзесяцігоддзямі прызвычаіліся слухаць любімае радыё, якое гучала круглыя суткі. Але ж, як слушна заўважае адзін з аўтараў пісьма ў рэдакцыю, «цяпер час камп'ютараў», іншымі словамі, жыццё не стаіць на месцы ў плане тэхнічнага прагрэсу.

Але самае, бадай, галоўнае, што трэба ведаць у тым ліку і нашым заяўнікам (і пра што, дарэчы, мы ўжо неаднойчы пісалі раней), — фактычна змянілася толькі тэхналогія дастаўкі інфармацыі да абанента, бо ўсе праграмы засталіся ў эфіры. Адключылі менавіта праваднае вяшчанне, а не цалкам яго ліквідавалі. Альтэрнатыва праваднаму радыё — УКВ-прыёмнік. Дарэчы, нашы заяўнікі згадваюць, што раней абаненцкая плата за карыстанне радыёкропкай каштавала капейкі. А вось пры эфірным прыёме дадатковая плата за карыстанне радыёпрыёмнікам і трансляцыю праграм налічвацца не будзе. Па падліках спецыялістаў, аплата спажытай радыёпрыёмнікам электраэнергіі будзе меншай, чым абаненцкая плата за праваднае вяшчанне. Да таго ж УКВ-прыёмнікі могуць працаваць не толькі ад пераменнага току, але і ад батарэек, што забяспечвае бесперабойны прыём праграм у выпадку адключэння электраэнергіі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Краіна здароўя

Выпуск №18 (371)

■ Дзіця хварэе

Зніжаем тэмпературу без лекаў

Калі малы, нягледзячы на ліхаманку, застаецца актыўным, то прызначаць гарачкапаніжальныя неабавязкова

Патрабуецца толькі далейшае назіранне за развіццём захворвання. Ліхаманка — павышэнне тэмпературы цела — абарончая рэакцыя арганізма. Многія вірусы і бактэрыі спыняюць размнажэнне або гінуць, стымулюецца выпрацоўка антыцел, утварэнне інтэрферону. Умераная ліхаманка — да 38,5 градуса — не выклікае дыскамфорту ў большасці дзяцей.



ЛІХАМАНКА МОЖА БЫЦЬ НЕБЯСПЕЧНАЙ:

* пры наяўнасці цяжкага лёгачнага або сардэчна-сасудзістага захворвання, цяжкай пнеўманіі або разумовай недастатковасці;

* пры тэмпературы вышэй за 41 градус, што можа прывесці да пашкоджання нервовай сістэмы;

* у дзяцей да 5 гадоў, асабліва паміж 6 месяцамі і 3 гадамі, калі існуе рызыка развіцця сутаргаў. Дрэнна пераносяць ліхаманку і дзеці першых двух месяцаў жыцця.

«Калі ў дзіцяці ёсць хранічныя захворванні лёгкіх, сэрца, нервовай сістэмы, раней былі сутаргі або яго ўзрост да 2 месяцаў, то гарачкапаніжальныя сродкі прызначаюцца пры тэмпературы 38 °С, — удакладняе **ўчастковы ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Святлана ДЗЯРУГА.** — Ліхаманка не лічыцца абсалютным паказаннем да зніжэння тэмпературы. Калі няма спадарожнай паталогіі, тэмпература цела не перавышае 39—39,5 °С і дзіця сябе нармальна адчувае, то ад лекаў лепш устрымацца. Лепей звярнуцца да іншых метадаў».

Для ўзмацнення цеплааддачы дзіця трэба распрануць і пакласці халаднаватыя кампрэсы на буйныя сасуды ў пахвіне, пад пахай, абцерці вадой пакаёвай тэмпературы. Гэтага бывае дастаткова для зніжэння тэмпературы. Абціраць спіртам або халоднай вадой не трэба — рэзкае зніжэнне тэмпературы можа выклікаць спазм сасудаў і зменшыць цеплааддачу. Дабівацца адразу нармальных паказчыкаў не варта, дастаткова панізіць тэмпературу на 1-1,5 градуса.

Калі нават пры 38 градусах ёсць дрыжыкі, дрэннае самаадчуванне, бледная і сухая скура, халодныя рукі-ногі і іншыя праявы таксікозу, гарачкапаніжальная тэрапія патрэбная тэрмінова.

Правілы прызначэння гарачкапаніжальных сродкаў

У раней здаровых дзяцей пасля 3 месяцаў — калі тэмпература вышэй за 39,0—39,5 °С, баляць мышцы і галава.

У дзяцей першых трох месяцаў — калі тэмпература вышэй за 38 °С.

У дзяцей з сутаргамі — пры больш чым 38—38,5 °С.

У дзяцей з цяжкімі хваробамі сэрца, лёгкіх, цэнтральнай нервовай сістэмы — пры больш чым 38,5 °С. ■

■ Псіхалогія для ўсіх

НЕ ВАРТА БАЯЦЦА

Адчуваеце трывогу, прыгнечанне, пакутуеце аб бяссонніцы і скачкоў ціску, не можаце справіцца з нейкай сітуацыяй — ідзіце да ўчасткавага тэрапеўта, парайцеся з ім адносна наведвання псіхолага або псіхатэрапеўта. Гэта абсалютна бяспечна і не пагражае ніякімі абмежаваннямі прафесійнай дзейнасці — за выключэннем рэдкіх выпадкаў, калі размова ідзе пра сур'ёзныя псіхічныя захворванні.

Псіхічнае здароўе — гэта і здароўе фізічнае, і сацыяльны статус, і псіхалагічныя асаблівасці, што дазваляюць пераадольваць цяжкасці, што ўзнікаюць. Дарэчы, калі вы цудоўна спраўляецеся з любымі падзеямі ў жыцці, то і асаблівых падстаў для хвалявання за сваё псіхічнае здароўе ў вас няма. Бо галоўнае ў жыцці што? Радавацца! Ці дакладней, пераважна радавацца і атрымліваць задавальненне. А гэта значыць, мець цёплыя сямейныя/партнёрскія стасункі, хадзіць на любімую работу, мець перспектывы росту і развіцця, і каб нам падобраму ўсяго гэтага не хапала — дзеля здаровага імкнення паляпшаць сваё жыццё.

Псіхічна здаровыя людзі не імкнуцца некага абвінавачваць, калі штосьці ідзе не так, яны ўсведамляюць, што на 2/3 жыццё залежыць ад іх саміх і шукаць вінаватых не варта. Дакладней, вінаватыя заўсёды толькі мы самі. Як ні войкай ды ні плачся, ты сам так вырашыў і зрабіў.

— А вось псіхічнае здароўе нацыі ў першую чаргу залежыць ад той увагі, якую дзяржава надае развіццю псіхіятрыі, адукацыі, — кажа **загадчык аддзела псіхічных і паводзінавых расстройстваў РНПЦ псіхічнага здароўя Міхаіл ВАЖЭНІН.** — У ЗША, напрыклад, неверагодна высокі ўзровень падрыхтоўкі псіхіятраў. Патрабуюцца вялікія асабістыя намаганні і грашовыя сродкі, і гэта зусім іншы ўзровень, калі параўноўваць з намі. Другі момант — адукацыя насельніцтва, якое павінна ведаць, што большасць псіхічных расстройстваў лечацца або дасягаецца рэмісія. Між тым, у галовах нашых людзей столькі «смецця», састарэлых стэрэатыпаў, што перш чым пачаць лячэнне, усё гэта трэба прыбраць. Людзі няправільна думаюць нават аб антыдэпрэсантах — маўляў, гэта прывыканне, суіцыд. А насамрэч гэта абсалютна не так!.. Яшчэ адна складовая — гэта ўзровень развіцця псіхіятрыі, псіхатэрапіі і псіхалогіі. І тут мы можам сказаць, што нават пры горшым тэхнічным забеспячэнні нам удаецца забяспечыць не горшую псіхічную дапамогу, чым у ЗША...

Адным з самых трагічных наступстваў псіхічнага расстройства з'яўляецца суіцыд. У структуры смяротнасці ва ўзроставай групе 15—35 гадоў самагубствы займаюць другое месца пасля дарожна-транспартных здарэнняў. Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, звыш 20 выпадкаў суіцыдаў на 100 тысяч насельніцтва — гэта высокі ўзровень, ад 10 да 20 — сярэдні, менш за 10 — нізкі.

9 з 10 краін з высокім узроўнем суіцыдаў размяшчаюцца ў Еўропе.

— У 1996 годзе краіна займала трэцяе месца на постсавецкай прасторы пасля Расіі і краін Балтыі — 35,8 выпадка на 100 тысяч, — тлумачыць **загадчык сектара псіхіятрыі РНПЦ псіхічнага здароўя Павел РЫНКОЎ.** — Да 2003 года паказчык штогод зніжаўся, у 2003-м быў невялікі ўздым, а пасля да 2009 — зноў зніжэнне да 27 выпадкаў на 100 тысяч. З 2009 года мы знізілі гэту лічбу да 18. Летась і сёлета тэндэнцыя зніжэння захоўваецца, і самай лепшай сітуацыя застаецца ў сталіцы — каля 7 выпадкаў на 100 тысяч. Праблематычныя пакуль Мінская вобласць — 27 і Магілёўская — 25.

Не адзінкавыя выпадкі

З 870 млн чалавек, якія пражываюць у Еўропе, каля 100 млн пастаянна адчуваюць трывогу і дэпрэсію. Больш за 21 млн пакутуе ад расстройстваў, звязаных з хімічнымі залежнасцямі, — алкаголь, наркотыкі. Звыш 7 млн пакутуе ад хваробы Альцгеймера і іншых дэменцый, зніжэння інтэлекту. 4 млн пакутуе ад шызафрэніі, біпалярных, афектыўных расстройстваў, дэпрэсіі і яшчэ 4 млн — ад панічных расстройстваў.

Летась у нашай краіне зарэгістравана 620 тысяч зваротаў па наркалагічную і псіхіятрычную дапамогу. Патрэбу ў такой дапамозе маюць 7 працэнтаў насельніцтва. Летась упершыню дыягназ псіхічнае расстройства быў устаноўлены больш як 68 тысячам беларусаў, з якіх 51 тысяча — дарослыя.

Да 40 працэнтаў усіх нявыхадаў на работу звязаны з псіхічнай паталогіяй.

На адзін завершаны суіцыд у Беларусі прыпадае каля чатырох незавершаных, калі чалавек застаўся жывым. У такіх выпадках патрабуецца спецыяльная дапамога, і тут няма чаго апасацца: гэты выпадак будзе зарэгістраваны для статыстыкі і не пагражае ніякімі абмежаваннямі, таму што гэта быў крызіс псіхічнага здароўя, няздольнасць самастойна знайсці рашэнне праблемы.

— Наогул у свеце праблема суіцыдаў даўно не лічыцца медыцынскай, — кажа Павел Рынкоў. — Каб знізіць высокі ўзровень суіцыдаў, мы таксама пайшлі па шляху ўцягвання ў прафілактыку розных структур і арганізацый. Навучылі медыкаў пярвічнага звяна выяўленню фактараў рызыкі, прапанавалі ім спецыяльныя апытальнікі, якія павінен запоўніць пацыент пры ўзнікненні нейкіх падазрэнняў. У кожную школу быў уведзены псіхолаг. У кожнай вобласці працуюць тэлефоны даверу. Былі распрацаваныя інструкцыі па прафілактыцы суіцыдаў сярод розных слаёў насельніцтва і прафесійных груп. Удалося абмежаваць доступ да, так бы мовіць, сродкаў і спосабаў учынення суіцыдаў — гэта выхады на дахі жылых дамоў, на аб'екты будаўніцтва, на высоткі ■

У крокавай даступнасці

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр спалучае сёння навуку, клініку (аказанне меддапамогі) і арганізацыйна-метадычную работу па ўсёй краіне. У клініцы — 1632 ложкі, з якіх большасць псіхіятрычных, 180 — наркалагічных і 12 — рэанімацыйных. Акрамя гэтага, па краіне працуюць 11 псіхіятрычных бальніц, 10 дыспансераў, тры абласныя клінічныя цэнтры псіхіятрыі і наркалогіі ў Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцях. Яшчэ ёсць і псіхіятрычныя аддзяленні ў бальніцах, аддзяленні дзённага знаходжання. У прыярытэце — стварэнне падраздзяленняў па-за псіхіятрычнымі арганізацыямі. У цэнтральных раённых бальніцах функцыянуе 151 псіхіятрычны кабінет і столькі ж наркалагічных. 25 кансультацыйных псіхіятрычных кабінетаў і 38 псіхатэрапеўтычных размяшчаюцца ў агульнасаматычных стацыянарах. 112 кабінетаў псіхалагічнай дапамогі дарослым ёсць у звычайных паліклініках.

У выніку 80 працэнтаў пацыентаў атрымліваюць псіхіятрычную дапамогу амбулаторна або ў аддзяленнях дзённага знаходжання.

■ Шкодная звычка

Далей ад цыгарэт

Парад, як кінуць курыць, даволі шмат, але, можа быць, якраз гэтыя дапамогуць менавіта вам.

Галоўнае, цвёрда вырашыць для сябе, што адмова ад курэння неабходная не толькі вам, але і вашай сям'і, бо, як правіла, дзеці ў такіх бацькоў таксама курыць, нагадвае **валеолаг 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Людміла БАРТАШЭВІЧ.**

1. Імкніцеся да таго, каб сёння выкурыць менш, чым учора.
2. Зацягвайцеся менш часта і глыбока.
3. Не курыце на галодны страўнік — прадукты згарання тытуню моцна шкодзяць яго слізістай.
4. Не пакідайце цыгарэту ў роце паміж зацяжкамі.
5. Не курыце на хаду, асабліва калі ўзнімаецеся па лесвіцы.
6. Імкніцеся як мага даўжэй не курыць пасля фізічнай нагрузкі.
7. Не курыце, калі курыць не хочацца.
8. Час ад часу рабіце перапынкі (не куру да панядзелка, канца месяца, дня нараджэння).
9. Правільна харчуйцеся, не пераядайце.

Самымі цяжкімі з'яўляюцца першыя пару сутак адмовы. Для пераадолення сіндрому адмены можна скарыстацца спецыяльнымі прэпаратамі — нікацінавымі пластырам, жуйкай, інгалятарам, якія прадаюцца ў аптэцы без рэцэпта.

Калі вы трымаецеся нейкі час, сцеражыцеся той адзінай цыгарэты, якая верне вас да таго, з чым вы так адважна змагаліся ■

■ Тэст на ВІЧ

Даведацца за 20 хвілін

З новага года ў аптэках можна набыць новыя экспрэс-тэсты на ВІЧ па сліне, у тым ліку айчыннай вытворчасці.

Простая працэдура не патрабуе забору крыві і ўсяго за 20 хвілін паведамляе дакладны вынік аб наяўнасці або адсутнасці ВІЧ-інфекцыі. Прастата і зручнасць сістэмы дазваляюць выкарыстоўваць яе практычна ў любых умовах, а не толькі ў медустановах. Дакладнасць выніку — 99 працэнтаў.

Сучасны від тэсціравання даступны ўжо для маладых людзей у цэнтрах, дружалюбных падлеткам, дзе кожны ахвотны можа бясплатна і ананімна зрабіць тэст — як звычайны, так і экспрэс, і атрымаць кансультацыю. Цяпер у Беларусі дзейнічае 50 такіх цэнтраў, адкрытых сумесна з Дзіцячым фондам ААН і Міністэрствам аховы здароўя. У цэнтрах працуюць урачы — педыятр, гінеколаг, псіхолаг, нарколаг, дэрматавенеролаг, валеолаг. На першай кансультацыі ўрач разам з падлеткам вызначае праблему, дае рэкамендацыі і пры неабходнасці запісвае да спецыяліста.

Магчымасць саматэсціравання з'явілася ў межах спецыяльнай кампаніі Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІД і Дзіцячага фонду ААН «Датычыцца нават тых, каго не датычыцца», якая ахапіла сёлета ўсе абласныя гарады.

У краіне зарэгістравана звыш 21 тысячы выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Большасць выяўленых выпадкаў прыпадае на ўзрост 15-49 гадоў. Паводле апошніх звестак, ВІЧ-станоўчы чалавек, які атрымлівае своечасовае лячэнне, можа пражыць гэтак жа доўга, як здаровы. Пры эфектыўным лячэнні верагоднасць перадачы віруса іншаму чалавеку значна зніжаецца. Жанчына з ВІЧ можа нарадзіць здаровае дзіця, калі своечасова даведаецца пра свой дыягназ і пачне лячэнне ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Ваш індэкс

ВАГА НА КАНТРОЛІ

Адзін з даступных метадаў самакантролю — назіранне за масай цела.

Вымяраць яе можна нават штотыдзень і разлічваць індэкс масы цела па формуле ІМЦ = МЦ (кг) / рост (м²). Пры ацэнцы гэтых вынікаў абавязкова трэба ўлічваць узрост. З узростам абедзве мяжы нормы ІМЦ змяшчаюцца ў бок іх павышэння.

Узрост, гадоў	17-18	19-24	25-34	35-44	45-54	55-64	65 і болей
ІМЦ, кг/м²	18-23	19-24	20-25	21-26	22-27	23-28	24-29

Калі вага павялічваецца або зніжаецца пры адсутнасці ацёкаў, варта паразважаць над колькасцю калорый, што паступаюць з ежай. Нязначныя ж хістанні адлюстроўваюць галоўным чынам змяненні воднага балансу і не патрабуюць карэкцыі.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 23 ноября 2016 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Продавец и его юридический адрес: Открытое акционерное общество «Строительно-монтажный трест № 40», Гомельская область, г. Жлобин, ул. Барташова, 1, тел. (02334) 2 05 50

1	Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	Аукцион состоится **23 ноября в 11-00** по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»		
2	Срок приема документов	**с 9-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 по рабочим дням по 18 ноября 2016 года**		
3	Номер лота	1	2	3
4	Наименование объекта (лота), адрес	двухэтажное кирпичное административное здание с кирпичной отапливаемой пристройкой, двумя тамбурами, мощением, забором с инвентарным номером 320/С-13500, расположенное по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Шоссейная, д.145	комплекс зданий, в том числе: – одноэтажное сборно-щитовое, облицованное кирпичом, административное здание с кирпичной отапливаемой пристройкой, тамбуром, уборной с инв. № 320/С-14089; – одноэтажное кирпично-блочное здание гаража с надстроенным бытовым помещением с инв. № 320/С-22472; – одноэтажное металлическое здание склада с эстакадой с инв. № 320/С-22473; – одноэтажное из газосиликатных блоков здание склада для хранения строительных материалов с инв. №320/С-24072; – одноэтажное здание склада из газосиликатных блоков с двумя пристроенными гаражами из газосиликатных блоков с инв. № 320/С-22474, расположенных по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, Жлобинский район, ул. Шоссейная, д. 145	одноэтажное кирпично-панельное здание склада с двумя кирпичными пристроенными гаражами и кирпичным пристроенным бытовым помещением и асфальтобетонной площадкой с инв. № 320/С-22471, расположенное по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Шоссейная, д.145
5	Краткая характеристика объекта	Назначение: здание административно-хозяйственное площадью 629,9 кв.м	Назначения: – здание административно-хозяйственное (инв. № 320/С-14089), площадью 140,8 кв.м; – здание специализированное автомобильного транспорта (инв. №320/С- 22472), площадью 97,1 кв.м; – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (инв. № 320/С-22473), площадью 78,2 кв.м; – здание специализированное складов, хранилищ (инв. № 320/С-24072), площадью 99,6 кв.м; – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (инв. № 320/С-22474), площадью 386,2 кв.м	Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально- технического снабжения, хранилищ, площадью 1759,2 кв.м
6	Площадь занимаемого земельного участка, га	участок № 1 — 0,2443	участок № 2 — 0,3248	участок № 3 — 0,8750
7	Начальная цена объекта (лота) (с НДС) со снижением на 80 процентов, рублей	63 840 (638 400 000*)	38 400 (384 000 000*)	94 080 (940 800 000*)
8	Задаток для участия в аукционе	6 000 (60 000 000*)	3 000 (30 000 000*)	9 000 (*90 000 000)
		Имеется обременение в регистрационных действиях	Имеется обременение в регистрационных действиях	Имеется обременение в регистрационных действиях, находится в ипотеке
Шаг аукциона 5%				

* – цена указана в денежных знаках образца 2000 года

Аукцион состоится **23 ноября 2016 г. в 11-00** по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным организатором аукциона.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Желающим участвовать в аукционе необходимо **по 18 ноября 2016 года включительно с 9-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 по рабочим дням** представить в адрес организатора аукциона следующие документы:

– заявление на участие в аукционе;

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

– юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

– иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

– иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

– представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) представляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

– копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

– копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

– сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательном порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Задаток перечисляется на р/с КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» №3012006530013 в филиале 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним претендентом, предмет аукциона продается этому претенденту при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До проведения аукциона с участниками заключается соглашение, в котором предусмотрены права и обязательности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, в том числе и размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона (конкурса), и (или) возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; участниками, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

Победитель торгов обязан:

– в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона внести на расчетный счет КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» вознаграждение по результатам аукциона в размере 4% от начальной цены проданного объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;

– в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи объекта;

– по лотам №№1, 2 в течение 15 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи произвести оплату за объект либо рассрочка на три месяца, путем перечисления на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Гомельского областного исполнительного комитета;

– по лоту № 3 в течение 15 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи произвести оплату за объект либо рассрочка на три месяца, путем перечисления на погашение основного долга по кредиту ЦБУ №305 ОАО «Белинвестбанк» г. Жлобин.

Телефоны организатора аукциона: (02334) 3 16 16, 3 14 08.

Телефоны продавца для справок: (02334) 2 05 50, моб. тел. 8 (029) 618 50 41.

Извещение о реализации имущества ОАО «Барановичидрев» на повторных торгах 04.11.2016 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит повторные торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости и прочего имущества:

Конт. тел. 8-029-3997931 vel.; факс/тел. 8-(0163) 455124; Emal:mischuk_am@mail.

Торги состоятся 04 ноября 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ: -1-е повторные торги.
ЛОТ №2

1) - изолированное помещение прирельсовый склад с инвентарным номером 110/С-112254, общей площадью 1 130,6м² (86 355 рублей, без НДС).

2) - изолированное помещение арочный склад, с инвентарным номером 110/С-112253, общей площадью 452,5м² (38 285 рублей, без НДС).

Лот №2 расположен на земельном участке пл. 0,7480 га.

ОБЩАЯ ЦЕНА ЛОТА №2: 124 640 рублей, без НДС.

ЛОТ №3 - изолированное помещение арочный склад с инвентарным номером 110/С-111817, общей площадью 530,91м². Лот №3 расположен на земельном участке пл. 0,4697 га.

ЦЕНА ЛОТА №3: 44 935 рублей, без НДС.

Цены по лотам снижены на 5% от первой цены, установленной независимым оценщиком.

ЛОТ № 4 - турбогенераторная установка ТГ 06С/04-Р13/4,0, для выработки электрической энергии. Мощность — 6000 кВт. 6-е повторные торги — скидка составила 93%.

НАЧАЛЬНАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №4 — 20.000 рублей, без НДС.

ЛОТ №6.3 - обрабатывающий центр ЧПУ-ROVER-B/50-BIESSE, инв.№194, предназначен для сверления и фрезерования панелей, 4-е повторные торги, скидка составила 78%.

НАЧАЛЬНАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №6.3 — 20.000 рублей, без НДС.

Местонахождение объектов торгов: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Объекты торгов расположены на общем земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота в рублях РБ.

Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи.

Назначение платежа — задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе.

Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок до 14 часов 00 минут 01.11.2016 г. организатору торгов — председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 20.10.2016 года.

Председатель ликвидационной комиссии
ОАО «Барановичидрев» А.М.МИЩУК

Ларыса Александроўская, адзінокая Кармэн беларускай сцэны



Упачатку мінулага стагоддзя ў правінцыйным Мінску жыццё біла ключом: развіваліся прамысловая вытворчасць, гандаль, чыгунка. У 1890 годзе быў пабудаваны і ўрачыста адкрыты Гарадскі зімовы тэатр, дзе праходзілі пастаянныя гастролі розных оперных труп. У кінатэатрах «Ілюзіён» на Захар'еўскай і «Мадэрн» на Губернатарскай круцілі першыя «блакбастары». У маі 1911 года ў горад прыязджаў знакаміты авіятар Утачкін і кружыў у небе над Камароўкай... На гэтых мерапрыемствах нязменна прысутнічала з дзецьмі адна маладая сямейная пара — Пампей Васільевіч і Вольга Мікалаеўна Александроўскія.

Ён працаваў у чыгуначнай сферы і быў атлетычна складзеным, дужым мужчынам, весялуном. Пампей Александроўскі захапляўся руска-турэцкай і французскай барацьбой, цяжкай атлетыкай, уступіў нават у Мінскае пажарнае таварыства, меў добры голас і спяваў у саборным хоры. Яго жонка была прыгажуняй, вельмі адукаванай жанчынай. У іх было шасцёра дзяцей.

Жылі яны дружна. Летнімі вечарамі на вуліцы Правіянцкай, каля дома №9, часта гучала музыка: у кветнік як найвялікшая каштоўнасць выносіўся грамафон, прывезены Пампеем Васільевічам з Пецярбурга. Слухалі пласцінкі — Шаляпіна, Давыдава, скрыпача Яна Кубеліка. А таксама непараўнальную Варвару Паніну з цыганскімі рамансамі. Дома заўсёды былі балалайка, гітара, мандаліна. Дзеці таксама цікавіліся музыкай, асабліва маленькая Ларыса (яна была пятым дзіцем у сям'і). Вельмі хутка асвоіла балалайку, а потым — мандаліну...

Ларыса Пампееўна Александроўская нарадзілася ў Мінску ў 1904 годзе. У яе былі выдатныя вакальныя даныя. Як спявачка пачала выступаць з 1920 года ў трупе Галоўпалітасветы Заходняга фронту. Музычную адукацыю атрымала ў Белмузтэхнікуме. Вучылася ў студыі оперы і балета ў Мінску. З 1933 года — артыстка Беларускага тэатра оперы і балета. Выконвала як сапранавыя, так і мецца-сапранавыя партыі. У час Вялікай Айчыннай вайны выступала з канцэртамі на франтах, у шпіталях і партызанскіх атрадах. З 1951 года была адначасова і галоўным рэжысёрам Беларускага тэатра оперы і балета. У год ёй удавалася выпускаць па два прэм'ерныя спектаклі. З'яўлялася ініцыятарам стварэння і нязменным старшынёй Беларускага тэатральнага таварыства (1946—1980, з 1976 — ганаровы старшыня). Ларыса Александроўская выбіралася кандыдатам у члены ЦК Камуністычнай партыі Беларусі, была дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР II—IV скліканняў. Памерла 23 мая 1980 года ў Мінску. Пахавана на Усходніх могілках г. Мінска.

У пачатку 1915 года, калі баявыя дзеянні Першай сусветнай вайны сталі набліжацца да Мінска, сям'я Александроўскіх паехала ў Пецярбург. Ларыса вучылася з Надзеяй Алілуевай, сябравала з Таняй і Адай Ліпкоўскімі — сястрой і малодшай дачкой вядомай спявачкі Марыінскага тэатра Лідзіі Ліпкоўскай. Першае наведванне оперы засталося ў памяці Ларысы назаўжды — гэта была пастаноўка «Снягуркі» з удзелам той жа Ліпкоўскай у Марыінцы. Тое, што ўбачыла Ларыса Александроўская, яе ўразіла: было гэтак велічна і незвычайна, што ўяўлялася абсалютна нязбытным, нерэальным. І ўжо дома дзяўчынка ўзялася спяваць, гадзінамі праседжваючы за піяніна, якое з'явілася ў іх кватэры. Бацька даў грошы на інструмент, з дзецьмі займаўся піяніст-выкладчык. Дома Ларыса спявала для гасцей.

У 1917 годзе маладая Александроўская пераходзіла ў апошні клас гімназіі. Тым часам пачалася Лютаўская, а затым Кастрычніцкая рэвалюцыя. Ларыса бегала да асабняка Кшэсінскай слухаць Леніна.

На адным з паэтычных вечароў у пачатку 1918 года Лора, якой толькі што споўнілася 16 гадоў, спявала з сяброўкай дуэт Лізы і Паліны з «Пікавай дамы» Чайкоўскага. На вечарыне прысутнічала вядомы пецярбургскі педагог-вакаліст Алена Сарна-Салаўевіч (былая салістка Марыінскага тэатра), яна і прапанавала Ларысе прыходзіць да яе і павучыцца вакалу. Урокі працягваліся ўсяго два—тры месяцы — да канца навучальнага года. На экзамене, які адбыўся ў пачатку чэрвеня 1918-га, прысутнічалі запрошаныя салісты Марыінкі. Голас Александроўскай быў успрыняты камісіяй як лірыка-каларатурнае сапрана. Сярэбраны званочак — так называлі яе голас. Ларыса вырашыла заняцца сістэматычна вакалам з восені, паралельна вучачыся ў апошнім класе гімназіі. Планы не ажыццявіліся: пачалася грамадзянская вайна, а сталіцу перавялі ў Маскву. З'ехала ў Маскву і маці, Вольга Мікалаеўна. Ларыса з братам і сястрой адправіліся да бацькі ў Архангельск.

ПОШУК ШЛЯХУ

Архангельск з'яўляўся буйным паўночным портам. Тут яны вымушаны былі застацца надоўга: горад апынуўся пад англійскай акупацыяй. Ларыса рвалася ў Мінск ці Маскву — да маці: яна пайшла ў ваенную камендатуру і пераканала акупацыйныя ўлады ў тым, што ёй неабходна дабрацца разам з братам і сястрой да Мінска. Галантны афіцэр не змог адмовіць у просьбе прыгожай блакітнавокай дзяўчыне з доўгай русай касой.

Заканчваўся 1919 год. У Мінску было трывожна і голадна. Александроўская пасяляецца на вуліцы Чырвонай, у доме яе дзядзькі, дзе будзе жыць да паступлення ў тэхнікум. На гэтай жа вуліцы пройдуць і першыя гады замужжа, тут народзіцца сын. Зусім побач, у раёне былога Конскага плацу, збіраліся ўдзельнікі Беларускай хаткі — клуба мастацкай інтэлігенцыі. Тут ставіліся спектаклі Галубка, п'есы Чарота, рэгулярна бывалі Колас і Купала. Але Ларыса была на раздарожжы, не ведала, чым заняцца, куды падацца. І паступіла нарэшце на кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы пры Народным камісарыяце адукацыі, на якіх рыхтавалі педагогаў для вёскі. Скончыўшы курсы, Александроўская адправілася па прызначэнні ў Старыя Дарогі — вучыць дзяцей грамаце.

Вучыла нядоўга: пачуўшы, як спявае новая настаўніца на адным з канцэртаў у гонар гадавіны рэвалюцыі, жыхары прасілі спяваць яе яшчэ і яшчэ, а пасля канцэрта сталі хадайнічаць, каб яе забралі назад, у Мінск, вучыцца на сапраўдную спявачку.

Адночы на адным з выступленняў да яе падышоў незнаёмы мужчына і спытаў, ці не хацела б яна спяваць у тэатры. Гэта быў Зміцер Захар — вядомы ў будучыні дзеяч беларускай музычнай культуры, які стварыў Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструментаў. Першае ж выступленне Александроўскай у сольнай партыі вызначыла яе вядучае становішча ў трупе. Акрамя тэатра, артысты павінны былі працаваць у іншых установах на розных пасадах, бо тэатральнага заробку на жыццё не хапала.

Ларыса прапрацавала сакратаром гарадскога ваеннага камісара аж да 1924 года. У гэтыя гады яна пазнаёмілася са сваім будучым мужам — Нікандрам Міхайлавым. Ён быў маладым камісарам, выдатным выступоўцам, завочна вучыўся на юрыдычным факультэце ўніверсітэта, які скончыў у 1924 годзе. Пазней ён працаваў пракурорам Вярхоўнага суда БССР. У мужа быў даволі добры голас — мяккі барытон, ён іграў на фартэпіяна і часцяком акампаніраваў Александроўскай. Яны пажаніліся ў 1924 годзе, шлюб іх доўжыўся да 1931 года. Затым, ажаніўшыся другі раз, Міхайлаў з'ехаў працаваць ва Уладзівасток пракурорам Ціхаакіянскага флоту. А Ларыса выйшла замуж за Мікалая Очкіна — ваеннага, які быў даўнім яе прыхільнікам (Нікандр Міхайлаў загінуў у жніўні 1941 года, служачы на Балтфлоце).

Да пачатку 1920-х у Мінску не было ні музычных школ, ні, тым больш, кансерваторыі. Адным з першых адкрыўся Музычны тэхнікум у 1924 годзе. Яго дырэктарам стаў скрыпач і дырыжор Аркадзь Львовіч Бяссмертны, які скончыў Пецярбургскую кансерваторыю. У ліку першых навучэнцаў музтэхнікума была і Ларыса Александроўская. Яе педагогам стала Леаніда Баланеўская, якая скончыла Пецярбургскую кансерваторыю.

Потым Александроўская перайшла ў клас запрошанага з Кіева прафесара Цвяткова. Менавіта яго яна лічыла сваім галоўным педагогам. Ларыса валодала дзіўнай памяццю, лёгка завучвала доўгія тэксты, магла дэкламаваць на памяць вершы, якія ведала з дзяцінства. А ў оперы не прызнавала суфлёра. Будучы любімай вучаніцай Цвяткова, яна сама адчувала да яго гарачую прыхільнасць. Арыстакратычныя манеры, старамодныя звычкі педагога, яго высокая патрабавальнасць да мастацтва выклікалі ў Александроўскай глыбокую павагу, пакланенне.

Перад чацвёртым курсам яе і цымбаліста Стаса Навіцкага нечакана запрасілі ў Маскву, а адтуль у ліку 27 артыстаў Савецкага Саюза — удзельнічаць у Міжнароднай музычнай выставе ў Франкфурце-на-Майне. Канцэртнае выступленне складалася з шэрагу асобных тэатралізаваных карцін, прысвечаных мастацтву розных народаў і аб'яднаных агульнай задумай, — руская карціна, украінская, беларуская, башкірская, якуцкая... Поспех быў велізарны. Гастролі скончыліся зімой 1928 года.

У асабістым жыцці ў Ларысы адбылася знамянальная падзея — у 1929 годзе ў яе нарадзіўся доўгачаканы сын Ігар. Тым часам у Мінску, пры музычным тэхнікуме, быў адкрыты спецыяльны двухгадовы клас з кансерваторскай праграмай.

Некаторы час работай опернага класа кіраваў Цвяткоў, а пасля яго ад'езду з горада — Антон Баначыч — бліскучы оперны спявак, які скончыў Пецярбургскую кансерваторыю. Ён спяваў многія партыі разам з Шаляпіным, працаваў пад кіраўніцтвам Рахманінава, дубліраваў рэпертуар Собінава. У класе ішлі заняткі па ўсіх дысцыплінах, у тым ліку па сцэнічнаму майстэрству і нават мастацтву грыма. Былі пастаўлены два спектаклі — «Русалка» Даргамыжскага (1929), «Севільскі цырульнік» Расіні (1930), перакладзеныя на беларускую мову.

Неўзабаве оперны клас быў рэарганізаваны ў Беларускую дзяржаўную студыю оперы і балета. Студыя размяшчалася на вуліцы Кірава ў адным пакоі, дзе адначасова туліліся ўсе салісты, хор, балет і захоўваўся рэквізіт, дэкарацыі, касцюмы, якія, дарэчы, артысты шылі самі.

НАРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ОПЕРЫ

Падзея, якую так доўга чакалі, адбылася 23 мая 1933 года. Цёплым вясновым вечарам мінская публіка ўпершыню ішла ва ўласны Беларускі тэатр оперы і балета на спектакль «Кармэн». Крытыкі і прэса захапляліся «надзвычайнымі галасавымі данымі, чысцінёй інтанацый, вялікай культурай, выдатнымі сцэнічнымі магчымасцямі, свабодай манеры выканання, якія вылучылі Александроўскую ў шэраг найлепшых артыстак Саюза».

У 1939 годзе на Траецкай гары быў узведзены грандыёзны тэатр-палац па праекце Іосіфа Лангбарда. Грандыёзныя маштабы сцэны патрабавалі новых дэкарацый і мастацкіх рашэнняў. Ларыса Пампееўна развучвала новыя партыі ў операх «Кветка шчасця» Туранкова, «Міхась Падгорны» Цікоцкага, «У пушчах Палесся» Багатырова. Балетная трупа рыхтавала нацыянальны балет «Салавей».

Раскошная Александроўская ў сваёй канцэртнай сукенцы пачала чытаць тэкст на рускай мове. І раптам пачуўся характэрны нягучны голас Сталіна: ад Беларусі трэба і чытаць па-беларуску. І Александроўская, не павёўшы брывом, тут жа прадоўжыла па-беларуску.

Прэм'ера оперы Цікоцкага адбылася 10 сакавіка 1939 года. Александроўская захоплена выконвала партыю Марысі, рыхтуючыся да маючай адбыцца Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Творчая садружнасць Ларысы Александроўскай і Яўгена Цікоцкага, якая захавалася на ўсё жыццё, пачалася менавіта з гэтай оперы. У 1939 годзе артысты былі адзначаны першымі ганаровымі званнямі — заслужанымі артыстамі рэспублікі сталі Балоцін, Дзянісаў, Друкер, Млодэк.

І. Ахрэмчык «Ларыса Александроўская», 1958.

Першае ў гісторыі беларускага музычнага тэатра званне народнай артысткі БССР было прысвоена Александроўскай. І тут жа яе ўключылі ў склад дэлегацыі ад рэспублікі для прывітання на днях Дэкады ў Маскве ў чэрвені 1940 года. Прывітанне павінен быў зачытваць Янка Купала, але ён наадрэз адмовіўся. І тады агульным рашэннем гэта даручылі Ларысе Пампееўне. У зале прысутнічалі Сталін, Варашылаў, іншыя кіраўнікі савецкай дзяржавы. Раскошная Александроўская ў сваёй канцэртнай сукенцы пачала чытаць тэкст на рускай мове. І раптам пачуўся характэрны нягучны голас Сталіна: ад Беларусі трэба і чытаць па-беларуску. І Александроўская, не павёўшы брывом, тут жа прадоўжыла па-беларуску.

Аляксей Талстой пісаў пра яркія ўражанні, якія зрабіла на яго Александроўская з яе цудоўным голасам і велізарным сцэнічным талентам.

Сталін у гэтыя дні прысутнічаў у Вялікім тэатры як мінімум тры разы. Слухаў «Міхася Падгорнага», «У пушчах Палесся» і грандыёзны канцэрт у гонар заканчэння Дэкады, дзе ў апошнім нумары праграмы саліравала асляпляльная Александроўская ў раскошнай белай сукенцы.

Пасля канцэрта Ларыса Пампееўна была запрошаная да правадыра, і адбылася важная размова ў прысутнасці членаў савецкага ўрада, першага сакратара ЦК КП(б) Беларусі Панамарэнкі. Яны выказалі ёй сваё непадробнае захапленне. За дэкадныя спектаклі прымадонна беларускай оперы была ўдастоена ордэна Леніна, і ёй першай з беларускіх артыстаў прысвоілі ганаровае званне народнай артысткі Савецкага Саюза.

НА ДАРОГАХ ВАЙНЫ

У чэрвені 1941-га, як звычайна, у мінскіх тэатрах закончыўся сезон, артысты сталі раз'язджацца — хто ў адпачынак, хто на гастролі. Драматычны тэатр імя Янкі Купалы з пачатку месяца — на гастролях у Адэсе, артысты тэатра оперы і балета — хто дзе, многія з'ехалі ў Крым, хтосьці адправіўся ў Прыбалтыку. Александроўская нікуды не паехала, засталася ў прыгарадзе Мінска, Драздах. Там размешчаны ўрадавыя дачы, і ёй, як ардэнаносцу, лаўрэату і народнай артыстцы, выдзелілі на лета пакой. Яна збіраецца туды ў пачатку чэрвеня разам з сынам Ігарам (яму ў гэты час было 12 гадоў) і сястрой. Муж Александроўскай, Мікалай Аляксеевіч Очкін, служыць у войсках супрацьпаветранай абароны і пастаянна ў раз'ездах па акрузе.

Сама Ларыса, яе брат і сястра разам з многімі жыхарамі беларускай сталіцы вясной і ў пачатку лета 41-га ўдзельнічаюць у суботніках — мінская моладзь будуе рукатворнае возера на Свіслачы за Старажоўскімі могілкамі. Апошні суботнік праходзіць 21 чэрвеня, адкрыццё прызначана на нядзелю...

Тым часам 19 чэрвеня, у дзень, калі збіраліся паехаць на дачу, у Ігара здараецца прыступ апендыцыту. Хлопчыка экстранна аперыруюць у 2-й клінічнай бальніцы (яна і цяпер стаіць на тым самым месцы). Даведка з гэтай бальніцы захавалася ў архіве Александроўскай як памяць аб апошніх мірных днях і «прыгодах» першых тыдняў вайны.

22 чэрвеня — вайна, першыя налёты варожай авіяцыі. Ларыса бяжыць у бальніцу да Ігара. Другі дзень вайны (і чацвёрты пасля аперацыі сына) праходзіць адносна спакойна, масіраваныя бамбардзіроўкі яшчэ не пачаліся, і многія гараджане нават не верылі, што гэта — вайна, вайна сапраўдная і, на жаль, на нашай тэрыторыі. Мінчане з цікаўнасцю разглядалі нямецкія бамбардзіроўшчыкі, якія праплывалі ў небе, а калі савецкаму знішчальніку ўдавалася збіць хоць адзін з іх, на вуліцах чуліся радасныя крыкі і нават апладысменты. Па ўспамінах Александроўскай, усвядомленага пачуцця небяспекі яшчэ не было. 24-га раніцай муж паспеў патэлефанаваць ёй дахаты, але дапамагчы ўжо нічым не мог. У той жа дзень, у 9.40 раніцы, на Мінск быў здзейснены масіраваны налёт, у якім удзельнічала каля паўсотні варожых самалётаў. За гэты дзень налёты паўтараліся тройчы.

...Раскіданыя, як пушынкі, камяні, якімі была выбрукаваная вуліца, на скрыжаванні Савецкай і Урыцкага ляжаць перакуленыя трамвайныя вагоны, пераўтвораныя ў брацкую магілу... У 3-м Доме Саветаў (дом, дзе жылі Александроўскія) жанчыны і дзеці выратавалі схавацца ў падвале. Бомба, якая выбухнула побач, выклікала пажар. Агонь перакрыў усе пад'езды і выхады. Там загінула больш за 100 чалавек. Гарэў ад запальных бомб увесь горад, яго ніхто не тушыў.

У бальніцы, куды здолела прабрацца па пылаючым горадзе Александроўская, яе сустрэў хірург словамі: «Усе, хто можа, — уцякайце». А як ісці, пяты дзень пасля аперацыі, швы яшчэ не знятыя. У накідах сваіх успамінаў шмат пазней Ларыса Пампееўна запіша: «Маглі сысці толькі мы. Стары камуніст, які ляжаў у палаце з пераломамі абедзвюх ног, і яшчэ адзін хворы, той нават не прыйшоў у сябе пасля наркозу, вымушаныя былі застацца. Дапамагла сыну апрануцца, усталі і пайшлі. Урач даў на дарогу бутэльку з віном — змазваць сыну вусны для падтрымання сіл, ды яшчэ шпрыц з ампулай — зрабіць укол, калі яму стане дрэнна. Што рабіць з гэтым шпрыцом, я не ведала, але ўзяла. Мінск гарэў, налёты не спыняліся. Народ сыходзіў. Але куды ісці?! У Маскву! Але як? Швы ў Ігара не знятыя, дакументаў няма, грошай таксама няма. На мне толькі лёгкая сукенка, французскія туфлі на абцасах і... ордэн Леніна (надзела на ўсялякі выпадак, сыходзячы раніцай з дому)».

Забраўшы сына з бальніцы, Ларыса Пампееўна адвяла яго ў бамбасховішча і пакінула са сваёй сястрой, а сама пабегла ў тэатр. Дырэктар тэатра Гантман падрыхтаваў для эвакуацыі супрацоўнікаў два грузавікі, для іх нават бензін назапасілі, але ў мітусні машыны бясследна зніклі.

